

Старое Корніна ☞ 3

# Ніва

## ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

АНЖАЛІКА БОРЫС ☞ 9



http://niva.iig.pl
redakcja@niva.iig.pl

№ 30 (2567) Год L | Беласток, 24 ліпеня 2005 г. | Цана 2,00 зл.




Фота ЮЛІІ ДАРАШКЕВІЧ

# Дзеля Беларусі

**— Мы заўсёды жылі і працавалі дзеля дабра і карысці нашай Бацькаўшчыны, — заявіла Алена Міхалюк, старшыня Згуртавання беларусаў Вялікабрытаніі. Ейныя словы адлюстроўваюць цалкам тую атмасферу, якая адчувалася сярод удзельнікаў чацвёртага З'езда беларусаў свету „Бацькаўшчына” ў Мінску, праведзенага ў мінулыя выхадныя.**

„Мы выходзім з таго, што ўсе мы разам: як тыя, хто нарадзіўся і жыве ў Беларусі, гэтак жа і тыя, хто па волі лёсу апынуўся па-за межамі Бацькаўшчыны — ёсць Народ Беларусі. Мы ўсе — адзін для аднаго, мы ўсе разам — для Беларусі. Беларусі вольнай і незалежнай, дэмакратычнай і заможнай, роўнай сярод роўных у сусветнай супольнасці нацый”, — чытаем у прынятым з'ездам звароце да суайчыннікаў.

У нарадах З'езда прынялі ўдзел 340 дэлегатаў з Беларусі і замежжа. Наша, беларусаў з Польшчы, дэлегацыя аказалася другой па колькасці — пасля суродзічаў з Расіі. Гэтага прадстаўнічага форуму беларускага духу не знайшлі часу і ахвоты павіншаваць улады краіны. Няма таксама прынятай дзяржавай праграмы „Беларусы ў свеце”. А жаль, бо здаўна вядома, што дыяспара і нацыянальныя меншасці — найлепшыя паслы сваёй духоўнай Бацькаўшчыны.

— Вітае Вас краіна Беларусь, — гаварылі ўдзельнікам З'езда арганізатары. А яны, Міжнароднае грамадскае аб'яднанне „Згуртаванне беларусаў свету «Бацькаўшчына»” пад кіраўніцтвам прафесара Анатоля Грыцкевіча і Алены Макоўскай цягам апошняга часу выканалі салідную працу. Была праца з дзяцьмі, навуковыя канферэнцыі, выдавецкая дзейнасць... Ствараецца архіў, які паспрыяе выданню энцыклапедыі, распаўсюджваецца бюлетэнь пра дзейнасць дыяспараў. Не забылася кіраўніцтва „Бацькаўшчыны” пра моцную і рашучую падтрымку нам, беларусам Польшчы, у закалоце з „Нівай”. Спадзяюся, што пад кіраўніцтвам новага старшыні, мастака Аляксея Марачкіна, „Бацькаўшчына” не саступіць з абранага шляху. Трэба прытым памятаць, што арганізацыя дзейнічае без аніякіх дзяржаўных датацый.

— Мы вінаватыя перад памяццю Васіля Быкава, за тое, што не прызналася яму Нобелеўская прэмія, — так распачаў сваё выступленне паэт, былы прадстаўнік Беларусі пры Арганізацыі аб'яднаных нацыяў Генадзь Бураўкін. — У нас не горшыя паэты за Віславу Шымборскую ці Ёсіпа Бродскага. Таму прапаную, каб усе дружна працавалі на прысваенне гэтай прэміі Рыгору Барадуліну.

Дзядзька Рыгор, бо так цёпла гавораць пра яго ў Беларусі, у час З'езда падпісаў некалькі соцень свайго зборніка „Ксты”. Для мяне падзеяй сустрэчы была таксама прэзентацыя поўнага збору твораў Васіля Быкава у трох тамах. Ад колькасці займальных кніжак проста кружылася ў галаве. Усе ўдзельнікі з'езду нагадвалі кніганошаў. Будзе што чытаць пасля вяртання з духоўнай Бацькаўшчыны.

**Яўген Вапа**

*Прэзідыуму і ўдзельнікам чацвёртага З'езду Беларусаў Свету „Бацькаўшчына”*

*Шаноўнае Спадарства!*

*Апошнія гады цяжка палічыць спрыяльнымі для беларускай справы. У такой сітуацыі словы аб узаемадапамозе і падтрымцы беларускай грамадскасці свету набіраюць вельмі выразнага значэння.*

*Праграмная Рада Тыднёвіка Беларусаў у Польшчы „Ніва” менавіта ў час найвышэйшага форуму беларускай дыяспары выказвае падзяку ўладам ЗБС „Бацькаўшчына” і ўсім арганізацыям беларускага замежжа за арганізаваную і аказаную нашай арганізацыі і выданню маральную падтрымку на працягу апошніх двух гадоў. Не абыкавай была і дэмакратычная супольнасць у самой Беларусі. Гэта Вашыя заявы, адкрытыя лісты салідарнасці, накіраваныя ў наш адрас і ўладам даюць сілу выстаяць у змаганні з непраўдзівымі абвінавачаннямі з боку фінансавых кантрольных установаў і пракуратуры.*

*Праз год (у 2006 г.) беластоцкі тыднёвік „Ніва” адзначыць свой юбілей. За намі — пяцьдзесят гадоў азнаямлянbacks на сваіх старонках з жыццём беларускай меншасці ў Польшчы і з беларускай духоўнай прасторай увогуле. Спадзяемся, што нягледзячы на ўсялякія складанасці, будзе гэта свята свабоднага беларускага слова і радасная падзея для ўсіх беларусаў незалежна ад месца іх пражывання, таму што адчуваем сябе беларусамі і быць нам імі далей у кожным куточку свету.*

*Дзякую ўсім тут прысутным за гэта.*

***Старшыня Праграмнай Рады Тыднёвіка Беларусаў у Польшчы, Яўген Вапа***

*Беласток 14.07.2005*

## І цяпер Грунвальд ☞ 2

Віктар Сазонаў

*Гродзенскія чыноўнікі адмовілі актывістам БНФ у правядзенні акцыі, прысвечанай гэтай падзеі. Па сутнасці, чарговы раз забаранілі ўшанаваць продкаў, палеглых за Бацькаўшчыну. Для чаго? Якую небяспеку ўяўляюць для іх нашыя загінуўшыя ваяры? Чаму баяцца іх нават памерлых? Хіба напалохаліся, што іх ваярскі дух перасяліцца ў жывых...*

## У Камісіі ўсё цацы ☞ 4

Мацей Халадоўскі

*Усё паказвае на тое, што сеймавая Камісія нацыянальных і этнічных меншасцей не паспее заняцца абвінавачаннямі і сітуацыяй, якая ўзнікла пасля іх пастаўлення Найвышэйшай кантрольнай палатай і пракуратурай Беласток-Поўдзень Праграмнай радзе тыднёвіка „Ніва”...*

## У Новым Двары ☞ 5

Аляксандр Вярбіцкі

*У наваколлі Новага Двара адносіны да беларускасці даволі крайнія. Некаторыя вёскі, у тым ліку і згаданыя ра-*



*ней Хварасцяны, да беларускай справы непрыхільныя і туды я атрымліваю вельмі рашучую антырэкамендацыю...*

## Беларускія спартсмены ☞ 10

Уладзімір Хільмановіч

*Чэмпіянат Беларусі па веласпорце, які прайшоў у горадзе над Нёманам па трасе Гродна — Капцёўка, выклікаў вялікую цікавасць спецыялістаў і мінімальную гледачоў. Не ўмеюць пакуль у нас рэкламаваць належным чынам гонкі на раварах. Так што ім па папулярнасці далёка да гульнёвых відаў спорта. Першынство краіны сабрала не ўсіх мацнейшых гоншчыкаў...*

## Міхась Хмялеўскі ☞ 11

Міра Лукша

*Пасярод Беластока ішоў натоўп, які забіраў з кіёскаў нававыдадзеную „Ніву” і дэманстратыўна паліў яе як паходні. Кінуліся біцца хлопцы за сваё, а Міхась спыніў іх, супакоіў. «Вони прошлі, „Ніва” зосталась! — а ўсё ж магло б быць з намі, і невядома дзе кожны з нас быў бы сёння і як справы пайшлі б тады»...*

# Бацькаўшчына гэта...



*Збіраючыся на чацвёрты З'езд беларусаў свету „Бацькаўшчына", я вяртаўся думкамі да папярэдніх — хацелася ўлавіць характэрную гэтай падзеі эмоцыю. Перад польска-беларускай мяжой усё для мяне стала ясна — у такой ці іншай форме ўсім нам мроілася незалежнасць. Зразу ўспомнілася напісанае на пачатку 90-х гадоў мінулага стагоддзя эсэ Уладзіміра Арлова „Незалежнасць гэта...". У экстрыме эмацыянальнай напругі Арлоў выявіў спадзяванні наконт нармальнай еўрапейскай беларускай дзяржавы. Што з гэтага атрымалася — усе зараз бачым. Перасякаючы мяжу, неадольна захацелася мне напісаць пра тое, чым для беларуса з суседняй Беласточчыны з'яўляецца ягоная духоўная Бацькаўшчына. І няхай не пакрыўдзіцца Валодзя Арлоў за тое, што яго ны літаратурны тэкст стаўся для мяне публіцыстычнай інспірацыяй...*

*Бацькаўшчына гэта... калі патэлефануеш у дыпламатычнае прадстаўніцтва Беларусі ў любым кутку свету ды скажаш „Добры дзень", у адказ пачуеш такое ж беларускае, а не „Здравствуйте, слушаю вас". А калі занясеш прашэнне ў візе, то не захвалюешся — дадуць яе табе ці не. Аднаразовую, трохразовую, гадавую — а можа і цалкам адмовяць. Бо калі думаеш па-беларуску, то людзей такіх не надта хоча бачыць твая Бацькаўшчына. І крыўдна, і сорамна, калі з гонарам крочаць цэнтрам беларускай сталіцы псеўдаславянскія вычварэнцы, а табе прадвызначаюць самоту, забыццё, рэзервацыю...*

*Бацькаўшчына гэта... калі перасякаеш беларускую мяжу і радуешся культурнасці памежнікаў і мытнікаў, а не наколваешся на падазронасць ад кожнага слова на роднай мове. Асабісты вобыск,ператрус кніжак і газет толькі таму, што яны на мове Багдановіча і Купалы. А ўсе памежныя дакументы чытаеш і запаўняеш на „общепонятном". Ды ніхто не пажадае табе шчаслівай пабыўкі...*

*Бацькаўшчына гэта... калі глядзіш па тэлебачанні перамогу на міжнародным турніры беларускага спартоўца і ведаеш, што праз хвіліну залунае любы кожнаму беларусу бел-чырвона-белы сцяг, а словы і музыка гімна парадуюць веліччу і гістарычнай годнасцю. І радуешся, што тваю духоўную Бацькаўшчыну ведаюць у свеце, як краіну людзей культуры і навукі, як сярэднееўрапейскую дзяржаву, да якой хочацца прыехаць, а не як найхутчэй з'ехаць. Краіну гаспадароў і справядлівасці, якую паказваюць у свеце як каштоўнасць усяе нацыі, а не ўласнасць аднаго чалавека...*

*Бацькаўшчына гэта... калі шпацыруеш вуліцамі беларускага горада ці мястэчка ды іхнія назвы сваёй мінуўшчынай блізкія твайму сэрцу, а не колюць у вочы прозвішчамі катаў, якія ўчынялі над нашымі продкамі злачынствы генацыду. І не трэба табе баяцца, што аштрафуюць толькі за тое, што на тваім касцюме значок з Пагоняй. І ведаеш, што не пасаромеецца за цябе Францішак Скарына, ордэны якога зараз прысвойваюць самым ярым ворагам беларускасці, а шыльды з яго ным імем выкідаюць у сметніцу...*

*Бацькаўшчына гэта... калі пойдзеш у турысцкую вандроўку па Беларусі, і не пабаішся, што на кожным кроку захоча цябе абдурыць таксіст, афіцыянт, адміністратар гасцініцы ці аўтазапраўшчык. А калі захочаш пабыць на сваёй Бацькаўшчыне больш за тры дні, дык не будзеш думаць пра штраф з-за недапоўненай прапіскі. А за начлег у гатэлі з чыстай ваннай і туалетнай паперай заплаціш па адным для ўсіх тарыфе, а не ў пяць разоў, па замежным...*

*Бацькаўшчына гэта... краіна, у якой мае сябры і знаёмыя могуць пахваліцца: гэта мой бізнес, гэта пабудова дому для маёй сям'і, гэта мае дзеці, якія прыйшлі з беларускага канцэрта, на якім не адсеклі электратоку і не назвалі іх злоснымі хуліганамі толькі за тое, што слухалі сваіх рытмаў. Краіна, у якой мае сябры і надалей будуць праводзіць дабрачынныя акцыі, але дзеля вырашэння сацыяльных праблем, а не збору сродкаў на штрафы за беларускасць супольнай усім нам Бацькаўшчыны.*

**Яўген Вапа**

# Пад ручку з рэжымам



*І зноў Аляксандр Лукашэнка ўдарыў у выдуманага ў апошні час ворага — у Польшчу. Ягоныя замежныя службы выдалілі з Беларусі чарговага дыпламата. У гэты раз Анджэя Бучака, кіраўніка консульскага аддзела пасольства ў Мінску. Раней — першага сакратара тае пляцоўкі — Марка Буцьку. Абодва яны падтрымлівалі добрыя кантакты з законна новавыбранымі ў сакавіку ўладамі Саюза палякаў Беларусі, дэлегалізаванымі беларускім Міністэрствам юстыцыі і непагаджаючыміся на ўступчывасць у адносінах да рэжыму ўлад СПБ ачоленым Тадэвушам Кручкоўскім.*

*— Не скрываю, што сімпатызую новавыбранаму кіраўніцтву СПБ, — казаў прабываючы ў Варшаве ў час, калі беларускія ўлады выраша ылі аб яго выдварэнні Анджэй Бучак, дадаўшы, што ніколі не парушаў беларускага закона.*

*— Мабыць, гэта можна разважаць як вайну, — дыпламатычна выказаўся ён у размове з рэпарцёрам тэлеканала Польсат.*

*— Гэта таксама помста за падтрымку Польшчай дэмакратычнай апазіцыі на міжнароднай арэне, — казаў журналісту тэлеканала TVN Вінцук Вячорка, лідэр Беларускага народнага фронту.*

*Анжаліка Борыс, шэфіха распушчанага кіраўніцтва СПБ:*

*— Здарылася гэтак, бо ён зашмат памагаў палякам у Беларусі.*

*Ну, што ж, нервовасць і радыкалізм дзеянняў беларускіх улад мала здзіўляе. Можна гэта вытлумачыць, мабыць, боязззю Аляксандра Лукашэнкі перад паўторам украінскай аранжавай рэвалюцыі, у якой агромную ролю не адыграе, здаецца, грамадства ў сваёй масе, але станецца гэта ўдзелам сёння апазіцыйных, найчасцей падпольных сіл падтрымліваных „дыверсійнымі, заходнімі асяродкамі". У гэты сцэнарый — калькулюе, мабыць, рэжым — упісваюцца СПБ з Анжалікай Борыс ды падтрымліваючыя саюз паасобныя прадстаўнікі дыпламатычных і консульскіх службаў краіны-інспіратаркі м.інш. чатырох рэзалюцый Еўрапарламента, якія абвінавачваюць рэжым у Беларусі з усімі таго паслядоўнасцямі.*

*Былы міністр замежных спраў праф. Браніслаў Герэмэк, вядомы з сілы спакою, цяпер не скрывае абурэння:*

*— Нельга талераваць той разгул, які паявіўся з беларускага боку. Трэба дзейнічаць рашуча.*

*Ва ўсёй гэтай сітуацыі, аднак, дзіўныя, так сказаць, паводзіны польскага МЗС. Беларускія ўлады з палякамі ў Беларусі робяць што хочуць. Што здаецца быць відавочным пасля выдалення Анджэя Бучака, тое ж самае тварыцца ў адносінах да афіцыйнага прадстаўніцтва польскай дзяржавы. Пасля выдалення Марка Буцькі, па прынцыпе рыторсіі, польскі бок загадаў пакінуць краіну Максіму Рыжэнкову з пасольства РБ у Варшаве. Меў ён пакінуць Польшчу да 19 чэрвеня, аднак надалей знаходзіцца ў Польшчы. Чаму? У размове з „Rzeczpospolitą" прэс-інфарматар польскага МЗС блытана тлумачыцца:*

*— МЗС прыхілілася да просьбы намесніка пасла не выдаляць па асабістых прычынах.*

*— А што гэта за прычыны?*

*— Дакладна не ведаю, у чым справа.*

*Пры нагодзе такіх прынцыпаў гульні польскага МЗС і канкрэтна ў час, калі аб'яўлена рашэнне аб выдаленні Анджэя Бучака, у Беластоку адбывалася чарговая польска-беларуская канферэнцыя „Шлях да ўзаемнасці", а праз два дні канцэрт польскіх калектываў з Беларусі і беларускіх з Польшчы ў рамках мерапрыемства Беласток-Гродна. Арганізавалі яе супольна БГКТ з афіцыйнымі ўладамі Гродна. Пасля першага дня канферэнцыі Ян Сычэўскі, старшыня БГКТ, у размове з Яраславам Іванюком у Радыё Беласток гаварыў аб сітуацыі вакол СПБ:*

*— Не ведаю, якія былі канкрэтныя абвінавачанні ў адносінах да іх, які быў ход з'езда. Тое, што я чуў, гэта інфармацыі нейкага вуснага характару, магчыма, што не да канца кампетэнтныя. Я фактаў не ведаю, апроч таго, аб чым інфармуюць медыі, а яны часта паслугоўваюцца сенсацыяй, арыентуюцца на сенсацыю.*

*Анжаліка Борыс паявілася на канцэрце, Ян Сычэўскі прывітаў яе са сцэны, але абмінуў функцыю „старшыні СПБ" перад прозвішчам. Запытаўся я ў А. Борыс, які быў удзел Саюза палякаў у арганізацыі канферэнцыі і канцэрта:*

*— Наш Саюз быў ініцыятарам гэтага мерапрыемства. Сёлета наш удзел быў ніякі. Гродзенскія ўлады за нас вырашылі, хто паедзе на канферэнцыю і фэст. Нас нават не запрасілі да супрацоўніцтва. БГКТ адназначна выказалася за беларускімі ўладамі.*

**Мацей Халадоўскі**

# І цяпер Грунвальд



*Старадаўняя мудрасць кажа, што нельга зглавіць чорнага ката ўначы, у цёмным пакоі, з завязанымі вачамі, асабліва, калі яго там няма. Немажліва знайсці праўду там, дзе яе не можа быць у прынцыпе. А дзе павінен шукаць свой шлях народ, які збіўся з дарогі? Мо павучыцца ў заможнейшых суседзяў? А можа паверыць тым, хто сам сябе назваў яго збаўцамі? Ці можа рухацца наўгад? А ці не лепш зазірнуць у глыбінныя далечы гісторыі, ды паспрабаваць збудаваць будучыню на падмурках, якія стварылі тыя, каго даўно ўжо няма. Бо гісторыя настойліва працягвае тлумачыць, што нашы ўнукі будуць хацець дакладна таго, за што змагаліся нашыя дзяды. Бо народ, гэта не толькі тыя людзі, якія жывуць сёння, але і тыя, хто ўжо адышў сваё, і тыя, хто яшчэ не нарадзіўся. Кожны народ не толькі унікальны ў сваёй непаўторнасці, але яшчэ і вечны, калі не парваная таямнічая нітка, якая звязвае тых, хто яшчэ будзе, з тымі, хто ўжо быў. І будуць навечна асуджаныя пакаленні, якія ў сваіх пастановах і дзеяннях ігнаравалі волю памерлых і ненароджаных. А будучыня ёсць толькі ў таго, хто добра помніць сваё мінулае.*

*У беларусаў, стагоддзямі знішчалі гістарычную памяць. Знішчалі паслядоўна і мэтна. А тое, што знішчыць было немажліва, стараліся перайначыць па-свойму. Падчас Савецкага Саюза нас стараліся пераканаць у тым, што беларуская гісторыя пачалася толькі пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі. Цяперашнія „ідыёлагі", нават перасягнулі сваіх настаўнікаў. Яны разглядаюць нашую гісторыю ўжо толькі з другой сусветнай вайны. І зноўку ўсё перайначваюць, перарабляюць, перакройваюць... Каб толькі мы нічога не памяталі. Каб толькі нацыя нічога не ўспомніла. Бо калі ўспомніць, то больш не дазволіць валадарыць над сабой.*

*Нават даўняя перамога пад Грунвальдам, дзе продкі беларусаў афарбавалі поле бітвы сваёй крывёй, спадзеючыся, што гэтая ахвяра дазволіць іх народу самому ладзіць свой быт і будучыню, уяўляе небяспеку для сённяшняй беларускай улады. Гродзенскія чыноўнікі адмовілі актывістам БНФ у правядзенні акцыі, прысвечанай гэтай падзеі. Па сутнасці, чарговы раз забаранілі ўшанаваць продкаў, палеглых за Бацькаўшчыну. Для чаго? Якую небяспеку ўяўляюць для іх нашыя загінуўшыя ваяры? Чаму баяцца іх нават памерлых? Хіба напалохаліся, што іх ваярскі дух пераселіцца ў жывых.*

*За апошнія тры гады гродзенскія ўлады не далі апазіцыі аніводнага дазволу на правядзенне хоць якой акцыі. Але мерапрыемствы адбываліся заўсёды. Не зважаючы на кары і арышты, гродзенцы змагаюцца за сваё права быць вольнымі і незалежнымі людзьмі ў вольнай і незалежнай Беларусі.*

*І мерапрыемства, прысвечанае бітве пад Грунвальдам, таксама адбылося. Напярэдадні, актывісты БНФ прыбралі пляцоўку ля старажытнай Каложскай царквы, дзе ўсталяваны памятны знак „Пагоня на Грунвальд". З гэтага месца беларускія ваяры ішлі на захад у далёкім 1410 годзе. Яны тады і не падазравалі, што гэтая бітва будзе такой доўгай. Што іх нашчадкам прыйдзецца працягваць яе ажно ў 21-м стагоддзі. Але яны верылі, што перамогуць. Вераць у гэта і нашчадкі.*

*Таму зноў залунаў бел-чырвона-белы сцяжок на „Пагоні на Грунвальд", і ляглі ля памятнага знака белыя і чырвоныя кветкі. Мерапрыемства пачалося з малебна ў Каложскай царкве. Пасля ўдзельнікі акцыі з годнасцю прайшліся па памятных мясцінах і ўсклалі кветкі да помнікаў Давыду Гарадзенскаму і вялікаму князю Вітаўту. Зрабілі гэта з верай, што блізкі той дзень, калі з гонарам за сваіх славутых продкаў уклечныць і памоліцца на гэтым месцы кіраўнік Беларускай Дзяржавы.*

**Віктар Сазонаў (Гродна)**

*Фурманкі не месціліся ў вёсцы, а ў калодзежах станавілася малавата вады, каб напаіць усіх коней...*

# Корніна: мэта паломніцтва



Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

*Царква ўпісвалася ў каларыт вёскі і памяць многіх паломнікаў*

**Старое Корніна вядомае было ў мінулым з-за цудатворнай іконы Божай Маці, якую вывезлі ў час бежанства ў Расію. Тысячы паломнікаў, якія маліліся перад іконай, пераказвалі памяць аб ёй сваім дзецям і ўнукам. Зараз на прыхадскія святкаванні ў Корніна прыязджае таксама намнога больш людзей, чым у суседнія парафіі. Прыезджыя маюць нагоду паглядзець на прыгожую вёску. Вялікія мураваныя і драўляныя дамы найчасцей будаваліся ў сямідзесятыя і васьмідзесятыя гады. Маладшыя гаспадары жывуць у бацькоўскіх хатах, інвестуюць цяпер у свае аборы, сельскагаспадарчую тэхніку і наракаюць на еўрасаюзныя патрабаванні.**

## *Вёска вядомая з-за іконы Божай Маці*

— У даўнім мінулым наша вёска распасціралася ў напрамку Тафілаўцаў. Пасля з'яўлення іконы Божай Маці на дрэве, нашы продкі пабудавалі каля яго царкву. Пасля памалу ўсе жыхары старой вёскі перасяліліся на новае месца побач царквы, дзе раней рос лес. Тоўстае дрэва, якое зараз знаходзіцца пры нашай царкве, з'яўляецца парасткам ад таго дрэва, на якім з'явілася ікона Божай Маці, — кажа Анна Тамашук, якая з дзяцінства жыла ў Старым Корніне і запамятала аповеды сваіх продкаў. — З-за іконы Божай Маці наша царква была вельмі вядомай. У ёй малілася нават каралева Бона і падарыла прыходу шкатулку. У час бежанства наша цудатворная ікона была вывезена ў Расію і след па ёй загінуў у горадзе Арле.

Зараз галоўныя святкаванні ў Старым Корніне адбываюцца ў гонар праведнай Анны, якая прадстаўлена на вялікай іконе ў царкве разам са святым Іакімам.

— У мінулым вельмі многа паломнікаў прыязджала ў Корніна. Фурманкі не месціліся ў вёсцы і многія гаспадары затрымліваліся каля яе, а ў калодзежах станавілася малавата вады, каб напаіць усіх коней. Калі пешаходныя паломнікі будучы далёка за вёскай убачылі крыж над царквой, далей на каленях дабіраліся ў наш храм, — расказвае Анна Тамашук. — Многія асобы атрымалі дапамогу пасля малітваў перад нашай іконай Божай Маці. Мой бацька з іншымі жыхарамі вёскі вывезлі з царквы цэлы воз кастылёў, якія пакідалі людзі пасля аздараўлення.

## *Заняліся гадоўляй свіней*

Сельскагаспадарчы прадукцыйны каапературў узнік у Старым Корні-



*Аляксандр Чапко ўдала кіруе гадоўляй каля тысячы свіней*

не ў канцы пяцідзесятых гадоў (у часах росквіту належала да яго каля 40 гаспадароў) і можа таму здолеў пераадолець выпрабаванні. Амаль усе калхозы, што ўзнікалі на зломе саракавых і пяцідзесятых гадоў былі ліквідаваны, калі прыйшла гамулкаўская адліга. На калхознікаў з Корніна не было вялікага ідэалагічнага ціску, але ў іх калхоз ішла дзяржаўная дапамога. Толькі ў дзевяностых гадах умовы гаспадарання ў сельскай гаспадарцы памяняліся. Спынілася дапамога калхозам з дзяржаўнага бюджэту, а за працаўнікоў трэба было плаціць вялікую складчыну ў ЗУС. Сельскагаспадарчы каапературў у Корніне пераадолеў усе цяжкасці і разгортвае сваю дзейнасць. Зараз яго працаўнікі (разам са служачымі 16 асоб) гадуюць каля тысячы свіней і займаюцца прадукцыяй збожжа, у галоўным, на корм для свіней.

— У мінулым годзе быў добры плён збожжа. У сярэднім намалочвалі мы каля 7 тон пшаніцы з гектара. Іншыя плёны таксама былі добрымі, а цана была намнога вышэйшай ад сёлетняй. У гэтым годзе нізкая цана на збожжа робіць больш прыбытковай нашую гадоўлю свіней, — кажа старшыня сельскагаспадарчага кааператыва Аляксандр Чапко і вядзе мяне ў абору. Аказваецца, што фактычна толькі дзве асобы пастаянна наглядаюць за свіньмі і рыхтуюць для іх корм.

## *Паратунак у гадоўлі кароў*

Юрыя Тамашука спатыкаю на панадворку. Разам з сынам займаўся ён сельскагаспадарчымі работамі.

— Зараз зрабілі з гаспадароў нявольнікаў. Мае дзеці хіба не захочуць займацца сельскай гаспадаркай. Я тры разы мусіў мяняць напрамак прадукцыі і ўсе гэтыя змены патрабавалі вялікіх інвестыцыяў, — кажа ўсхваляваны Юрый Тамашук.

Мой суразмоўца раней гадаваў авечак, але ў пачатку васьмідзесятых гадоў іх гадоўля перастала быць прыбытковай. Пасля займаўся гадоўляй свіней, але і гэтая прадукцыя давала малы прыбытак. Зараз спадар Тамашук гадуе каля 50 штук быдла, у тым ліку 14 дойных кароў. У яго аборы ёсць вада і добрыя санітарныя ўмовы. На панадворку знаходзіцца ўмяшчальнік на малако, але не захаваны ўсе еўрасаюзныя патрабаванні наконт аборы.

— Калі не ліквідуюць структурнай пенсіі, то думаю на яе пераходзіць. Зараз прадукцыя збожжа не дае прыбытку. Малако таксама патанела. Мне раней плацілі больш 1 злотага за літр, а зараз атрымліваю звыш 90 грошаў. Выдатна падаражэлі сродкі прадукцыі і аховы расліннасці, — кажа Юрый Тамашук. — Зараз меншае колькасць гаспадароў у Старым Корніне. У наваколлі нашай хаты жыве ажно 4 адзінокіх пенсіянераў. Ёсць толькі чатырох маладшых гаспадароў, што ўзбуйнілі гаспадаркі і заняліся гадоўляй кароў.

Апошнім часам у Старым Корніне і навакольных вёсках паменшала колькасць дзяцей. Падставовую школу ліквідавалі каля дзесяці гадоў таму. Адрамантаваны пасляшкольны драўляны будынак аддалі праваслаўнаму прыходу, але яшчэ нявырашанае яго прызначэнне.

— У вясковым клубе знаходзіцца прыватная крама. Вучні гуляюць там у настольны тэніс. Аднак зараз вельмі мала ў нас дзетак. Праз некалькі гадоў будзе ў нас двое або трое дзетак на ўсю падставовую школу, — заяўляе жанчына, якой дзеці ўжо закончылі сярэднюю адукацыю.

— Вы па якой прычыне фатаграфуеце нашу вёску? — пытае мяне перад ад'ездам мужчына ў старэйшым узросце. Калі я гавару, што раблю здымкі для тыднёвіка „Ніва", мой суразмоўца Мікола Чурак супакойваецца. Інфармуе, што два гады назад укралі ў яго пару коней. Знайшлі віноўнікаў, але коней не вярнулі.

— Зараз ізноў гадую коней, бо прадукцыя збожжа неприбытковая. Тона жыта каштуе 150 злотаў, аўса — 180 злотаў, а за самыя сродкі аховы расліннасці, прадугледжаныя на



*Юрый Тамашук купіў машыну для ўборкі падсушанай травы*

гектар поля, трэба заплаціць 100 злотаў. Цана на каніну таксама панізілася з 10 на 6 злотаў за кіло, — гаворыць спадар Чурак. Разам з іншымі гаспадарамі ён моцна хвалюецца за раслінную прадукцыю, бо доўга не было дажджу.

**Аляксей Мароз**

## *Кінулі каўбасы*

Наша ўлада кінула невялікі кавалачак „выбарчай каўбасы” ў выглядзе дадатку для пенсіянераў, каб іх прыцягуць галасаваць на іхнія спіскі. Не падумалі толькі, як аблегчыць аформіць гэтую справу пенсіянерам. ЗУС і КРУС спярша выслалі больш васьмі мільёнаў паведамленняў усім пенсіянерам, даход якіх за мінулы год не перавысіў 9 600 зл., каб кожны асабіста ставіўся ў страхавальным бюро з запоўненым і падпісаным фармулярам. Некаторым старэйшым пенсіянерам каб трапіць у ЗУС ці КРУС, дык трэба пераадолець сорак і больш кіламетраў, часта з перасадкай. І каму не пад сілу адолець такую дарогу, то не атрымае згаданага дадатку.

На маю думку, працаўнікі гэтых установаў добра ведаюць, каму якую пенсію высылаюць, бо запаўняюць бланкі 12 разоў у год і ў тых установах знаходзяцца ўсе дакументы пенсіянераў. Да таго не кожны пенсіянер патрапіць запоўніць той фармуляр, то там пасадзілі працаўніка, які дапамагае запоўніць рубрыкі, але бярэ ад кожнай асобы 15 злотаў. Тут многія людзі старэйшага ўзросту або самотныя інваліды праклінаюць гэтую „выбарчую каўбасу” ды пытаюцца: „Ці ЗУС або КРУС не можа сам запоўніць тую паперку і прысланць каб я падпісаў і адаслаў назад пісьмом?”. Або проста кажуць: яны ж дасканала ведаюць колькі кожны пенсіянер атрымлівае грошай у год і ўсё вядома каму і колькі належыцца аднаразовай дапамогі. Так што кінуты кавалачак „выбарчай каўбасы”, як сабацы костка, можа пашкодзіць, а не дапамагчы на выбарчых спісках. **(мл)**

* * *

У чэрвені ЗУС пазасылаў пенсіянерам заявы, у якіх паведамлялася, што можна пахадайнічаць за аднаразовай даплатай да пенсіі, калі ў мінулым годзе даход не перавысіў 9 600 злотых. Стаўка дадатку складвае ад 22 да 300 зл. Каманда Марка Бэлькі такім чынам прыносіць пенсіянерам ды інвалідам перадвыбарчы падарунак. У мінулым годзе міністр Гаузнер паспрабаваў пашукаць рэзерву сярод старэчаў для палатання дзіркі ў бюджэце. Парламент прыняў закон, які паўплываў на тое, што пенсіянеры ў сакавіку не атрымалі пераацэнкі пенсій. Саюз левых дэмакратаў рашыў выправіць памылку дзеля таго, каб з’яднаць „самых бедных” і гэтыя на іх прагаласавалі ў набліжаючыхся выбарах. А ці падумалі аб тым, што гэтым „дадаткам” нарабілі палітыкі і тыя хто закон прыдумаў непатрэбнага закалоту і лішніх выдаткаў? Каб атрымаць пару злотых дык трэба прасіць кагосьці запоўніць заяву (не кожны старэча сам гэта зробіць), шломбаць у ЗУС і прастаяць у чарзе, каб здаць прашэнне. Як перадаюць СМІ, дык ЗУС апошнім часам праходзіць сапраўдныя аблогі. Дзеля чаго гэта патрэбна? Не нам судзіць, „хто праў, хто вінават”, як кажа народная мудрасць. Палітыка ёсць палітыка! **(ус)**

# Камісія: — Усё цацы...




*Чаму ў першыя месяцы пракурор Б. Кішло публічна заяўляла пра восем гадоў турмы для сябраў Праграмнай Рады „Нівы”, а цяпер заклікае іх: „Прызнайцеся да віноўнасці, то адыдзем ад пакарання”...*

**Усё паказвае на тое, што сеймавая Камісія нацыянальных і этнічных меншасцей не паспее заняцца абвінавачаннямі і сітуацыяй, якая ўзнікла пасля іх пастаўлення Найвышэйшай кантрольнай палатай і пракуратурай Беласток-Поўдзень Праграмнай радзе тыднёвіка „Ніва”.**

На апошнім пасяджэнні камісіі падляшскі дэпутат ад СЛД Яўген Чыквін ужо чацвёрты раз прапанаваў, каб яе дэпутаты выслухалі інфармацыю на тэму сітуацыі вакол тыднёвіка:

— Чаму ў першыя месяцы, калі справа набірала розгаласу, пракурор публічна выказвалася ў такі спосаб, што вялікім злачынцам пагражае восем гадоў турмы. Цяпер тая самая пані пракурор [гаворка аб пракурор Бажэне Кішло — М. Х.] заклікае іх: „Прызнайцеся да віноўнасці, то адыдзем ад пакарання”. Ці не лепш запытацца ў правасуддзя, чаму гэтак адбываецца.

На тое сцвярджэнне да нядаўна дэпутат ад СЛД, цяпер беспартыйны Ежы Штэліга спрабаваў тлумачыць:

— У міжчасе памяняўся Крымінальны кодэкс.

Яўген Чыквін:

— Вы гэта аб чым вярзеце?

Ежы Штэліга:

— Заклікаю дэпутата Яўгена Чыквіна да парадку! Гэта я цяпер старшыня абрад. Усе заявы прашу падаць у сакратарыят камісіі. Пры адпаведнай нагодзе, на чарговым пасяджэнні камісіі будуць яны прагаласаваны, згодна з рэгламентам Сейма.

Мабыць, гэтак і магло б быць, калі б не факт, што Сейм кончыць свае паўнамоцтвы. У планах працы камісіі меншасцей прадбачана толькі адно пасяджэнне, да таго прысвечана падвядзенню ейных здабыткаў. Няма большых шанцаў, каб прыняў у ёй удзел — як гэтага хацеў дэпутат Яўген Чыквін — прадстаўнік Міністэрства справядлівасці. На згаданым пасяджэнні гаварыў ён у чарговы раз:

— Я думаю, што варта было б выслухаць тлумачэнняў Міністэрства справядлівасці на тэму праводжаных дзеянняў. У 6 гадзін раніцы ці позным вечарам праводзіліся візіты ў хатах *Bogu ducha winnych* дзеячаў. Яны працавалі на грамадскіх пачатках. Не мелі ніякіх кантактаў ні з фінансамі, ні са справаздачнасцю [такога тыпу абвінавачванні прадставіла пракуратура адзінаццаці асобам звязаным з ”Нівай” — М. Х.].

Пасля пераконваў:

— У апошні час, асабліва ў кантэксце, несумненна слушных, намаганняў польскай дзяржавы за правы польскай меншасці ў Беларусі, паяўляюцца, у маёй ацэнцы, асноўныя пытанні: што польская дзяржава сказала б, калі б каму-небудзь з Палёніі ўсчыналіся крымінальныя працэсы на падобнай падставе.

І далей:

— У арганізацыях, дзе няма грошай ні на прафесійную абслугу (перш за ўсё юрыдычную), ні на сумленную бухгалтэрыю, дэталёвы кантроль без сумненняў выявіць нейкія хібы. Калі ўкрочым на такую самую сцежку, як у выпадку „Нівы”, то нарыхтуем сабе не адзінаццаць працэсаў супраць беларускіх дзеячаў, але шмат іншых, што вельмі блага прыслужыцца іміджу нашай дзяржавы.

Вядучы пасяджэнне Ежы Штэліга адбіваўся:

— Наша наводзячая прапанова: мы адкрытыя, але калі Камісія мела б гэтым заняцца, павінны звярнуцца ў гэтай справе зацікаўленыя асяроддзі. Да гэтага часу мы не атрымалі ад зацікаўленых ніякага сігналу.

Здаецца, дэпутат Штэліга не чуў шматлікіх сігналаў, якія падаваліся не толькі з асяроддзя звязанага з „Нівай”, але і ад беларускіх арганізацый не толькі з Польшчы. Не здзіўляюць затым сугучныя з яго выказваннямі словы радыкальна адмоўна стаўленага дэпутата Каталіцка-нацыянальнага руху (RKN) Ежы Чэрвінскага:

— Ні сеймавая Камісія, ні Сейм *in gremio* не могуць замяняць іншых дзяржаўных устаноў, а асабліва судоў.

У сваю чаргу прадстаўнік НКП Кшыштаф Керэс сумніўна пераконваў:

— Гэта не быў кантроль накіраваны на нацыянальныя меншасці, а асабліва на беларускую. Абвінавачанні, якія мы паставілі ў выніку кантролю, звязаны былі з парушэннем закону аб рахункаводстве. Нашым абавязкам было накіраваць справу ў органы правасуддзя.

Не сказаў ён, аднак, чаму ў выніку кантролю, які ахапіў больш за 150 устаноў у краіне, датаваных з бюджэту Міністэрства культуры, не накіраваны былі справы супраць іншых суб’ектаў, у выпадку якіх НКП сцвердзіла падобныя, а пават і значна больш сур’ёзны парушэнні. Пры нагодзе вярнулася справа неабходнасці падавання дэкларацый (згодна з распараджэннем Міністэрства адукацыі ад 2002 г.) моладдзю ці бацькамі, якіх дзеці хочуць вучыцца ў школах з беларускай мовай, што было вынікам аднаго з паралельна праводжаных кантроляў НКП.

— У гэтым аб’ёме ведамства адукацыі не сустрэлася з супрацівам ні адной нацыянальнай меншасці, — тут мінаўся з праўдай прадстаўнік НКП.

Дэпутат Чэрвінскі:

— Гэтак пастанаўляе закон. Якраз у гэтым выпадку НКП старалася — слушна і хвала ёй за тое — не столькі вымагчы, як прымяніць польскі закон.

Пасля дэпутат Чыквін безвынікова прыгадваў:

— У 70-х гадах была пастанова ЦК ПАРП аб маральна-палітычнай еднасці польскай дзяржавы. У рамках звязанай з ёю акцыі былі прыняты спробы ліквідацыі навучання моў нацыянальных меншасцей. Першым крокам было патрабаванне ад бацькоў пісьмовых заяў, ці хочуць каб іх дзеці вывучалі родную мову. Калі б дэпутат Ежы Чэрвінскі ведаў гісторыю, ведаў бы, што дзеячы маюць небяспечныя апаскі наконт вяртання ў тую сістэму.

І гэтак у прынцыпе кончылася дыскусія сеймавай Камісіі ў адной з дзвюх у апошні час найбольш розгалосных спраў, кранаючых беларускае асяроддзе. Што будзе адбывацца ў камісіі меншасцей у Сейме наступнага склікання, пасля праўдападобнай перамогі Грамадзянскай платформы (PO) і Права і справядлівасці (PiS)? Як кажа дэпутат Яўген Чыквін, паказваюць гэта мінулагодняя і сёлетняя сеймавыя дэбаты і галасаванне над законам аб меншасцях. PiS і PO ёй супрацівяўляліся (канчаткова адламалася некалькі дэпутатаў ад гэтых партый, галоўным чынам звязаных з кашубскім асяроддзем), а асабліва былі супраць запісу аб выкарыстоўванні дадатковай мовы ў гмінных установах і падвойных назваў у мясцовасцях, дзе пражываюць меншасці:

— Гэта была мерка адносін да меншасцей.

**Мацей Халадоўскі**

# Быццам свята

**Падаюся ў Новы Двор, каб адтуль наведаць Хварасцяны, вёску на самой граніцы, пра якую час ад часу гаворыцца, што мае там быць адкрыты пагранпераход. У Новым Двары заўважаю ларкі каля касцёла. У парку сустракаю мужчыну універсальнага ўзросту, — якому з выгляду можа быць і трыццаць, і семдзесят, — і пытаю яго, якое тут свята. Ён паціскае плячыма і раіць некага спытаць пра гэта. Маладзіца на лавачцы падказвае мне, што ў той дзень — 24 чэрвеня — адзначаецца Яна.**

Мой план маланкава правальваецца. Бо калі ў Хварасцянах каталікі, тады ў прыхадское свята я быў бы там крайне няпрошаным госцем. Валакуся праз мястэчка ў напрамку навадворскай царквы, звесіўшы нос. Бо ў часе маіх ранейшых наведванняў Новага Двара вакол тамашняй праваслаўнай плябаніі адзінока шалеў велізарны сабака, быццам міфалагічны Цэрбер, вартуючы ўваход у зямныя подступы Нябеснага царства. На гэты раз мне шанцуе. І сабака быццам меншы і менш заўзяты, і не на перадавой ён. Да таго ж яшчэ дзверы плябаніі адчыніліся і ў іх з'явіўся гаспадар.

Каб увайсці ў давер настаяцеля, вітаюся на царкоўны манер, быццам выяўляючы пароль у войску ці канспірацыі. Гэтакая хітрасць спрацавала і бацюшка ветліва задавольвае маю цікавасць. Калі гутарка кранае аднаго жыхара Хільмонаў, вядомага сваім рэлігійным нонканфармізмам, настаяцель уздыхае:

— Каб вось яго прыцягнуць да Царквы...

Бацюшка рэкамендуе мне наведаць пражываючага непадалёк старажыла. Я дзякую і цёпла развітваюся з ім, крыху ашарашаны неспадзяванай удачай у прадстаўніка — так бы сказаць — каставага ў нашых умовах саслоўя.

Найцямней, як гэта гаворыцца, пад ліхтаром, і я засумняваўся, у якую хату мне трэба завітаць. Пытаю напатканую жанчыну; яна рассейвае мае сумненні: трэба вярнуцца крышку назад. Адварочваюся, і бачу свайго нядаўняга чычэроне, які жэстамі паказвае мне тамашні і тагачасны шлях праведнасці, быццам артылерыйскі наводчык няўклюднаму стралку. Жэстам дзякую ўвасобленаму ў ролю добрага самараніна настаяцелю.

У гутарку з новым суразмоўцам уносіць разнастайнасць ягоная жонка:

— А чаго ты будзеш тут нейкаю балбатнёю займацца! — папракае мужа.



Фота АЛЯКСАНДРА ВЯРБІЦКАГА

*Касцёл у Новым Двары*

Я стараюся ёй патлумачыць, што названая балбатня гэта пустая і хлуслівая гаворка, а ў мяне цікавасць не да яе, але да канкрэтных і выпрабаваных фактаў. Ну, але кабета, як гэта кабета, сваё і так ведае.

Размова дакочваецца і да ўраджэнца Новага Двара — Станіслава Грынкевіча малодшага:

— Ягоны брат, Казьмер, таксама быў шчырым беларускім патрыётам; ён некалькі гадоў таму памёр. А калі быў раней памёр Станіслаў, ён усё ж быў крыху скрывіўся, што той усю спадчыну аддаў беларускай справе, не згануўшы пра сямейнікаў...

У наваколлі Новага Двара адносіны да беларускасці даволі крайнія. Некаторыя вёскі, у тым ліку і згаданыя раней Хварасцяны, да беларускай справы непрыхільныя і туды я атрымліваю вельмі рашучую антырэкамендацыю.

Кіруюся на адзін адрас у бок Хільмонаў. Сонца пачынае сваё сёлетняе працяглае летняе наступленне, намагаючыся ўжо ў канцы чэрвеня як найбольш ускварыць мяне; мо гэта і добра: пасля астанецца менш скварыцца за грэшнае жыццё...

У Бобры некалькі жылых блёкаў, некалькі вялікіх сельскагаспадарчых будынкаў, вакол лугі і нівы. Побач дарогі мужчына пытае, куды я кіруюся. Кажу яму, што ў Хільмоны. Інфармуе мяне, што я іду ў няправільным напрамку. Не веру яму, вымаю карту і пераконваюся, што сапраўды начэсваю пад дурнога хату. Дзякую свайму новаму добраму правадніку, абіраю правільны шлях. Ён яшчэ некалькі разоў услед мне падае штораз новыя арыенціры, быццам артылерыйскі наводчык няўклюднаму стралку...

Жвіроўка знеахвочвае да хады, дарога доўжыцца. Зноў сумняваюся ў падказках апошняга размоўцы. Сыходжу на сенажаць, дзе пажылая жанчына варочае граблямі сена. Крыху дзівуюся, што ў дваццаць першым стагоддзі яшчэ прымяняецца такая тэхніка.

— Муж на таблетках, — кажа мне, — а сын з самага ранку дзяжурыць у Канюшках у аднаго гандляра гарэлкай. А сена шкада, каб не змарнавалася. Калі пачнуцца канікулы, прыедзе памагаць дачка, якая настаўнічае ў Дуброве.

— У тых Канюшках, мабыць, і больш дзяжурных? — цікаўлюся я.

— Ёсць больш, але мой найпершы, з самай раніцы прапаў. Там лепш пасядзець, чым на сонцы на трактары.

— А лячыцца не прабаваў?

— Пра гэта нельга і згадваць!

Шчаслівая, не ўсе ўцякаюць у сенакос у развесялльныя мясціны. Сельскагаспадарчыя машыны выручаюць цяпер людзей, не трэба гнуць спіны, як калісьці. Абы толькі была добрая воля. Бо праца, як тлумачыў мне калісь адзін чалавек, гэта таксама малітва. Нават у свята.

**Аляксандр Вярбіцкі**

# Пракурор пабаяўся

30 чэрвеня і 1 ліпеня г.г. у беластоцкім тэлебачанні пачуў я, што пракурор Дарыюш Альшэўскі спыніў следства ў справе злачынстваў учыненых атрадам „Бурага” над жыхарамі беларускіх вёсак і аб нявінна памардаваных у 1946 годзе вазаках праваслаўнага веравызнання. Праўду кажучы, тады жаўнеры рэакцыйнага падполля ўсіх праваслаўных выганялі са сваёй з дзеда-прадзеда зямлі на ўсход, у Савецкі Саюз. Не забудуць гэтага жыхары, якія асталіся ў жывых са спаленых беларускіх вёсак Бельскага павета



*Для беларусаў „Буры” не герой падполля, а крыміналіст і ваенны злачынца*

і пабітых ім блізкіх нявінных людзей. Таксама не забудзе трагедыі вёска Патока Беластоцкага павета, якую спаліў атрад „Лупашкі” і памардаваў нявінных яе жыхароў.

Белыя карткі гісторыі трэба запоўніць чорным друкам, трэба апісаць усю праўду аб злачынствах на нявінным беларускім народзе толькі з-за таго, што ён праваслаўнага веравызнання. На маю думку, пракурор спужаўся што пасля парламенцкіх выбараў, калі да ўлады прыйдуць правыя палітычныя групоўкі, дык адклічуць яго з пасады і назавуць супрацоўнікам камуністаў.

Тут трэба сказаць, што гісторык павінен шукаць праўду і высветліць яе людзям. Такога чалавека ўсе будуць шчыра шанаваць і будуць яму ўдзячны. Мне здаецца, што не павінны замыкаць пад ключ тыя дакументы, а высветліць да канца трагедыю беларускага насельніцтва на Усходняй сцяне.

**Мікалай Лук'янюк**

# Вянкі ў Нараўцы

Ужо некалькі гадоў у пачатку ліпеня ў Нараўцы ладзяць абрадавае мерапрыемства „Ноч Купалы”. У гэтую нязвыклую адзіную летнюю ноч гараць кастры на беразе ракі, дзяўчаты і хлопцы співаюць песні і пускаюць вянкі на ваду, на сцэне выступаюць мастацкія калектывы.

Гэтак было і сёлета. Дык вось прыйшоў вечар 9 ліпеня. На небе аніводнай хмурынкі і прырода ў поўным росквіце. Фэст пачаўся з каляровага шэсця мастацкіх гуртоў з песняй „Купалінка” ды з асветленымі вянкамі, ад мясцовага гміннага асяродка культуры ў амфітэатр, дзе сабралася мнагалюдная публіка.

Каля 21 гадзіны пасля афіцыйнага адкрыцця (фэст адкрылі войт Нараўчанскай гміны Мікалай Павільч і старшыня Галоўнага праўлення БГКТ Ян Сычэўскі) на сцэне пачаліся выступы танцавальнага ды вакальных калектываў у народных касцюмах. Прыехалі яны з розных куткоў Беласточчыны ды з Беларусі. Зоркамі вечара былі ансамблі „Вербніца” і „Ойра” з Пружан, „Каларыт” з Жабінкі ды „Грымата” са Слоніма.

Пасля поўначы дзяўчаты панеслі кветкавыя вянкі на рэчку і пусцілі на плынь. Нараўчанскае неба паяснела ад успышак феерверкаў. Каскад спадаючых зорак выклікаў фурор у жыхароў.

А на пляцоўцы перад канцэртнай сцэнай пачалося народнае гулянне пад адкрытым небам. Граў да танца калектыў „Кантрольны вобраз” з Нараўкі.

Арганізатарамі мерапрыемства ў Нараўцы былі Беларускае грамадска-культурнае таварыства, войт Нараўчанскай гміны і Гміны асяродак культуры. Сёлета ён упершыню быў дафінансаваны са сродкаў Еўрасаюза ў рамках праекта „Зберагайма традыцыю «Ноч Купалы»”. **(мох)**

# Падглядаюць ці не?

У 26 н-ры „Нівы” ёсць тры шчыльна з сабою звязаныя артыкулы, прысвечаныя ўсходняй граніцы. У прыгранічных вёсках людзі хвалююцца, што пагранічнікі будуць іх падглядаць. Яны хутчэй падглянуць нашых прывабных кабетак і іх ногі вышэй кален. Думаю, што гэта не грэх і мо нават добра, што маладыя ваякі не ганьбуюць прывабнасцямі нашых беларускіх жанчын, бо скора настане той час, калі не будзе каго ў нашых вёсках падглядаць; яны паволі выміраюць, як пшаніца пасля засухі або макраты.

Пра вышкі магу сказаць, што яны няшкодныя, бо колькі ўжо гадоў у Дубічах стаіць такая вышка і нікому з нас і волас з галавы не ўпаў. І вайсковыя чыны супакойваюць нас, а ім — лічу — трэба верыць, бо гэта парадачныя людзі.

А дзяржаўная мяжа — на бяду ці не на бяду — была, ёсць і хіба доўга будзе існаваць, раздзяляючы наш народ, сваякоў. Бо наша старана мяркуе, што з усходу дуе вострыя і халодны вецер і нічога добрага адтуль нельга чакаць.

**Мікалай Панфілюк**



Ганна Кандрацюк (zorka@niva.iig.pl)

# зорка

для дзяцей і моладзі

# Каляровы дом свабоды...



У Сацах адпачывалі наймалодшыя

**Другі беларускі летнік для малодшых дзетак наладзілі ў самай прыгожай вёсцы Бласточчыны — у Сацах. Дзень пасля Такароў — з 11 па 16 ліпеня. Мясціна знаходзіцца ў „Краіне адкрытых аканіц”. Проста, тут казачныя хаткі з размаляванымі аканіцамі і арнаментамі. Вёска мае дзве вуліцы. Між імі, паміж квяцістымі лугамі і спеючым жытам, уецца рачулка. На краю вёскі — стары лес.**

— Дооооообрыыыы дзень! — гучна вітаюць дзеткі. Якраз вяртаюцца з крамы. У іхніх ручках каляровае марожанае.

— Сёння былі мы на рэчцы, купаліся, — кажуць.

Хоць з неба ліецца ліпеньскі жар, у грамадзе дзеткі не адчуваюць стомы. Усе падбадзёраныя, вясёлыя, лагодныя... Калі зойдзем на іх панадворак, дзеці памыюць ручкі і зразу пачнуць вышываць...

Раней сфатаграфуемся ля доміка з чароўнымі арнаментамі.

* * *

Над крытым ганкам процьма саламяных птушак, лялек, каляровых малюнкаў. Сярод іх хатка — „Дом свабоды”.

— Мы так назвалі сваю хату, — паясняе шчабятушка Лідка. — Бо тут мы адпачываем і гуляем. Калі Лідка вымаўляе апошняе слова, ад усмешкі на шчочках робіцца ямачкі.

— І спяваем, і вышываем, і гуляем у мячык, — дадае Нінка. У чорнавалосай дзяўчынкі сінія ад марожанага вусны.

Як у Такарах, так і тут дзеткі ў першы дзень напісалі кантракт. Сярод абавязваючых прынцыпаў — ветлівасць. Такія словы як добры дзень, прашу прабачэння, дзякуй, калі ласка — чуваць заўсёды. Дзеці ўсё з’ядаюць, не чмякаюць пры стале, не дуюцца. Прытым — усе размаўляюць па-беларуску.

— А калі забываецеся пра кантракт?

— Тады нашы апякункі называюць нумар і мы ўжо ведаем, ды просім прабачэння, — вельмі сур’ёзна сцвярджаюць нашы сябры.

* * *

За момант наведаем „Дом свабоды” — хатку пакажа яе гаспадынька Настка Лукашук. Разам бягуць і сяброўкі: Оля, Юлітка, Нінка і Лідка. У святліцы пануе прыемны халадок. На сценах размаляваныя аздобныя кветкавыя палоскі з ландышаў, папараці, рамонку, зазуліных званочкаў...

— Найбольш дакучаюць нам мухі, — заяўляе сур’ёзна Настка. Дзяўчынка — варшавянка, і мухі чамусьці здаюцца ёй вясковымі аваднямі. Як конікі, каровы ці авечкі, якія часам ходзяць па вуліцы.

[ *далей* ☞ **7** ]

## *Вершы Віктара Шведа*

### *Хуліганы*

*Стаяць хуліганы пад касцёлам,*
*З касцёла выйшлі маладажоны.*
*— Зараз убачыш, будзе крамола, —*
*Азваўся Франак да Лявона.*

*Падбег ён раптам да маладога,*
*Які ў настроі быў прыўзнятым.*
*І хоць было там вясельнікаў многа*
*Голасна крыкнуў: — Тата мой, тата!*

### *Лянота*

*— Пане доктар, — застагнаў Ігнат, —*
*Нейкая хвароба мучыць быццам.*
*Трэці дзень ужо падрад*
*Мне не хочацца зусім вучыцца.*

*— Бачу ты, сынок, зажартаваў,*
*Жартам адкажу табе з ахвотай.*
*Гэтую хваробу я б назваў*
*Звыклаю вучнёўскаю лянотай.*

# Польска-беларуская крыжаванка № 30

Запоўніце клеткі беларускімі словамі. Адказы (з наклееным кантрольным талонам) на працягу трох тыдняў дашліце ў „Зорку”. Тут разыграем цікавыя ўзнагароды.

| | | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | Hurt / Beksa | | Zasiew / Los | Śniadanie | | | Waga | | Ogrodzenie | Obraz |
| | | | | | | Szydło / Kawaler | | | | |
| | Sen / Rok | | | | Chan / Punkt | | | | Kotwica | |
| Mała Eugenia | | | | | | | | Jar / Przykład | | |
| | | | Rata | | Lipka / Sak | | | | | |
| Wezwanie | | Rosa | | | | | Raz | | | |
| | Park / Klasztor | | | | | | | | | Góra |
| | Ranek / Ars | Bierz | | | | | | | | |
| | | | | | Taktyk | | Ty | | | |
| | | | | Tak / Bródka | Ar | | | | | |
| Dźwig | | | | | | | | | | |

**Адказ на крыжаванку № 26:** Паклон, пол, раман, рыцар, замак, ара, арак, кіт, сола, шклянка, лес, скок. Спор, каса, ял, рамка, Рым, ікс, праца, так, мак, но, ар, ас, лён, арол, стралец, на, бакас.



Самыя любімыя заняткі малых летнікаў: вышыванка...



... і яда

# ... у чароўных Сацах



[ 6 ☞ працяг ]

Самае цікавае месца на гарышчы. Пад дахам, аздобленым малюнкамі зорак і месяца, знаходзіцца спальня. Вечарам, калі дзеткі памыюць ногі і зубы, спадарыні Аліна і Бася чытаюць ім казкі.

— А ўчора казкі апавядалі нам пані Валя і Вераніка з Мінска, — успамінаюць дзяўчынкі. Пра „Белую Даму”, пра „Чорную Даму”, пра „Даму Пік”, — пералічваюць. Апошняя была найстрашнейшай!

— А пасля мы самі прыдумвалі страшныя гісторыі, — дадае Нінка.

* * *

На летніку адпачываюць шаснаццаць дзяўчынак і двух хлопчыкаў: Мацвей і Пятрусь. Пятрусь амаль мясцовы, па-суседску жыве яго бабуля Соня. Яна разам з бабцяй Гандзяй рыхтуе дзеткам абеды. Сёння будзе кураціна з таўканічкай са скваркамі і кіслым агурком, расол з макаронай ды кампот з чарэшняў. Многія папросяць яшчэ „дакладку”...

— А ўчора былі варэнікі (вядомыя на летніку як *pierogi*) з трускалкамі і сырам, — прыгадваюць. Некаторыя дзеці з’елі па адзінаццаць штук гэтага смякоцця!

Хоць у Петруся пад бокам бабуля і тата, ён і не думае адлучацца ад летніка.

— Мы гуляем разам з дзяўчатамі, — заяўляюць весела хлопчыкі, — вышываем, спяваем песні, гуляем у мяч.

Пасля хвіліны маўчання ў Петрусю прабуджаецца ваяр:

— Бо, каб было больш мужчын, — марыць уголас хлапчук, — мы ў вайну пагулялі б! — Матэвуш пагаджаецца з сябрам:

— Так, так, — ківае галавой, — у вайну.

* * *

— Мы знаходзімся тут дзякуючы Яраславу Лукашуку, — кажа арганізатарка і апякунка летніка Аліна Ваўранюк. — Раней, мы не думалі пра летнік для малодшых дзетак. Аднак гаспадару гэтай хаты вельмі хацелася пасляць на беларускі летнік сваю дачушку Настку, і ён прапанаваў дзеля летніка свой дом у Сацах. Паколькі тут добрыя ўмовы для правядзення такіх заняткаў, мы рашыліся арганізаваць яшчэ адну групу.

У Сацах увесь свет беларускі. Усюды чуваць беларускую мову. У час храмавога свята св. апосталаў Пятра і Паўла дзеці пабывалі ў каплічцы на багаслужбе. Настаяцель пухлоўскай царквы заахвочваў мясцовых, каб дзяліліся з госцікамі вішнямі і чарэшнямі, трускалкамі і гароднінай.

— Мы таксама наведалі Уладзіміра Наумюка ў Канюках, — адзначае спадарыня Аліна, — а пасля сустрэчы вярталіся ў Сацы фурманкаю.

* * *

— Што, паводле вас, найфайнейшага ў Сацах? — пытаю малечаў.

**Юля:** — Каля хатак ёсць такія агародчыкі з кветкамі. У кожным агародчыку квітнеюць малінавыя і чырвоныя мальвы...

**Лідка:** — На кожным доміку, там дзе нумар хаты, вісіць такая таблічка з рэзьбленымі птушкамі...

**Нінка:** — Каля вокнаў каляровыя аканіцы...

**Юля:** — А пад стрэхамі такія карункавыя аздобы, якія напамінаюць дождж. Хаткі аздобленыя таксама па баках...

**Дар’я:** — Па вуліцы ходзяць каровы, авечкі, коні, куры...

**Оля:** — Калі мы рыхтуем яду, да нас заўсёды прыходзіць коцік...

**Нінка:** — Ноччу, калі пакладземся спаць, у вёсцы гаўкаюць сабакі...

**Оля:** — Тут плыве рэчка, у якой мы сёння купаліся...

* * *

У першы дзень летніка дзеткі сумавалі па бацьках, плакалі. Сёння расплакалася гаспадынька Настка. І не з-за растання з мамай ды татам, не. Амбітная дзяўчынка расплакалася... бо не атрымоўвалася ў яе вышыўка. Каб суцішыць маленькую Ксеню, доктар Барбара Пякарская прыгалубіла малечу і суцяшала добрым словам. Доктар Барбара — або як завуць яе дзеткі — пані Бася — прысвяціла на летнік свой летні водпуск. Разам з мужам знайшлі спонсараў, дзякуючы якім дзеці адпачывалі за сімвалічныя грошы.

— На свята Пятра і Паўла нашы дзеці атрымалі ад Міраслава Пякарскага мяшок фэставых ласункаў: усякіх лізакаў, мачкаў, грыбочкаў, — адзначае Аліна Ваўранюк.

— Чаму падтрымоўваем ідэю летніка? — думае ўголас доктар Барбара, — бо тут адпачываюць і вучацца нашы дзеці.

**Зорка**

**Фота Ганны Кандрацюк**



Яду рыхтавала бабуля Соня



Барбара і Аліна — апякункі летніка

# „Белавежа” збіраецца

Беларускае літаратурнае аб’яднанне „Белавежа” сабрала на сваім чарговым справаздачна-выбарчым сходзе 26 чэрвеня роўна трынаццаць асоб, хоць гэта не ўсе, якія друкуюць свае тэксты на старонках беларускіх (і не толькі) выданняў. За апошні тэрмін (ад 8 чэрвеня 2002 г.) выдалі ўсе „белавежцы” разам 25 кніг. З гэтага года выдавецкія магчымасці практычна спыняюцца, паколькі можна спадзявацца на невялікую падтрымку адно толькі на гадавік „Тэрмапілы”. Праўда, сябры аб’яднання друкуюцца не толькі ў Бібліятэцы „Белавежы”, але шкада было б тармазіць такую плённую выдавецкую дзейнасць, якою не ў змозе пахваліцца ні адно літаратурнае згуртаванне меншасці ў Польшчы, але і ні адна літаратурная суполка.



Фота МІРЫ ЛУКШЫ

*Частка літаб’яднання пад Цэнтрам праваслаўнай культуры. У цэнтры — першы старшыня „Белавежы” Георгій Валкавыцкі*

Ян Чыквін, старшыня БЛА, склаў справаздачу з дзейнасці арганізацыі і яе ўправы. У справаздачы ўспомніў як аб дасягненнях „Белавежы” і яе сяброў, так і аб цяжкасцях у рэалізацыі некаторых планаў. Звярнуў увагу на тое, што па прычынах незалежных ад управы не змог быць рэалізаваны ад трох гадоў пастулат аб амаладжэнні Аб’яднання. Не былі рэалізаваны па фінансавых прычынах (недахопе сродкаў) выданні ў кніжнай форме твораў Зьніча, Янкі Юхнаўца і Масея Сяднёва. Сканцэнтраваў сваю ўвагу на двух асноўных пытаннях, якія былі і надалей застаюцца актуальнымі — на справах арганізацыйных ды чыста творчых, якія датычаць асабістай адказнасці творцы, літаратара, за кшталт свайго твора, а таксама за фармаванне літаратурнага працэсу. Сустрэчы — семінары і іншыя, за амаль паўстагоддзя дзейнасці аб’яднання, былі калісьці (часцей) і школай пісання, і нагодай да сяброўскай бяседы ды паказання сваіх новых твораў. За апошні час былі скліканы чатыры толькі такія сустрэчы (па пару дзён). Управа сустракалася 12 раз. Двойчы з візітам гасцяваў у нас старшыня Саюза пісьменнікаў Беларусі. Сталі ўжо традыцыяй сустрэчы беларускіх пісьменнікаў са студэнтамі універсітэта ў Беластоку. Надалей часта праводзіліся ў розных месцах у краіне і за мяжой аўтарскія сустрэчы сяброў „Белавежы”. Незвычайнай падзеяй у гісторыі „Белавежы” было ўшанаванне сябры БЛА Сакрата Яновіча высокай узнагародай імя Анджэя Дравіча *Semper Polonia.* Старшыня прыгадаў таксама, што аб творчасці „белавежцаў” узнікае чарговая габілітацыйная праца (Ірыны Саматой з Віцебска). А найважнейшае гэта тое, як падкрэсліў Ян Чыквін, што тыя 25 кніг беларускіх аўтараў Беласточчыны былі заўважаны чытачамі, літаратурнымі крытыкамі і даследчыкамі, паявіліся рэзэнзіі. Вялікім поспехам з’яўляецца і тое, што надалей выдаюцца два літаратурныя і беларусазнаўчыя гадавікі — *Тэрмапілы* і *Annus Albaruthenicus — Год беларускі.* З’яўляюцца яны альтэрнатывай для паступова нішчаных у Беларусі літаратурнага друку і свабоднага слова. Удалося сёлета выдаць у нас яшчэ дзве кнігі з серыі Бібліятэкі „Белавежы”, хоць і на іх „ветліва адказала” Міністэрства ўнутраных спраў, пад чыёй апекай ужо ўсе беларускія справы, што „па прычыне на абмежаваную колькасць фінансавых сродкаў, прадбачаных на рэалізацыю конкурсу ў 2005 г.” былі яны „разгледжаны адмоўна”. Якога конкурсу?..

У склад новай управы БЛА ўвайшлі: Ян Чыквін (старшыня), Сакрат Яновіч (намеснік старшыні), Міра Лукша (сакратар), Юры Баена (скарбнік), Галіна Твардновіч (член управы).

**Міра Лукша**

# *Мыліся снегам*

**Успаміны Дзмітрыя ВАЙЦЕШЫКА, народжанага ў 1923 годзе ў Габятах.**

У школу ў Цецяроўку хадзіў я ад лістапада да красавіка, чатыры гады, а ў летні сезон хадзіў за пастуха. Пасвіў не толькі сваё — праз сем гадоў пасвіў і ў чужых вёсках, м.інш. два гады ў Зубках.

У 1939 годзе для мабілізацыі ганяў коней у Сакаляны за Саколкай. Калі немцы наступалі на саветаў, то каля Габят загінула шмат савецкіх салдат. Спярша хавалі іх там, дзе ляжалі, а пазней пахавалі іх на ўзгорку за вёскай. За нашаю хатай сем чалавек ляжала, а з наваколля Габят назносілі 48 трупаў. Пасля вайны іх перапахавалі крыху вышэй, у новую брацкую магілу адлеглую каля дваццаці метраў ад старой. Некаторыя астанкі былі яшчэ ў гімнасцёрках, ад некаторых адно косці асталіся; там яны пакояцца і па сённяшні дзень. Пагінулі яны ад кулямётаў на ножках, і немцы іх білі, хаця падымалі рукі, каб здацца. Калі палонны збег з шашы, каб каласок сарваць, то немец адразу яму кулю ў лоб. Ад Ялоўкі ішоў танк і аднаго салдата, што двух немцаў забіў, раз’ездзіў на блін.

Конь аднаго капітана мо з два тыдні ўсё прыходзіў на магілу свайго камандзіра. Не маглі таго каня злавіць, і толькі як у рэчку каля Баброўнік загналі, тады толькі ўдалося яго акружыць і злавіць.

На балоце зараз за Габятамі, мо з пяцьдзесят метраў за вёскай, немцы наладзілі лагер для ваеннапалонных, абвялі яго калючым дротам. Хто там быў з суседніх вёсак, таго жанкі або сваякі забіралі, а тых што асталіся, пасля некалькіх тыдняў некуды пагналі.

Я быў хаваўся ад немцаў, каб да работы не ўзялі, але адзін немец высачыў мяне каля хлява. Выхапіў ён пісталет, але мяне не забіў. Загадаў мне ўзяць касу і жыта касіць. Я папрасіў яго, каб мяне адпусціў, абяцаючы яму дваццаць яек. Ён мяне адпусціў, а я зноў схаваўся, да часу, аж фронт адышоў далей і тых немцаў ужо тут не было.

Калі немцы адступалі, спалілі ўсю нашу вёску. На кожную хату нешта сыпалі і яна загаралася. І ўсе дрэвы, што каля хат раслі, загадалі пазрэзваць; я сам ссякаў грушы. У той час з Бабро ўнік прыехаў нейкі нямецкі начальнік, паведамляючы, што рускія ўжо ў Ваўкавыску. Тады ўсе немцы — і тыя што падпальвалі, і тыя што рэйкі зрывалі — паўцякалі.

На другі дзень з’явілася савецкая разведка. Нам раней адзін немец паказаў, дзе замініравана рэчка і мы, мінаючы тыя мінныя загарадзі, кінуліся праз рэчку ў лес і перачакалі час наступлення. Калі вярнуліся, то адно пажарышча на месцы нашай вёскі было. І жывіны, што былі мы з хлявоў павыпускалі, многа пабітай ляжала на балоце.

Мама на пажарышчы есці варыла, над печкай на слупках палажылі мы фанеру. І зямлянку я паставіў, але не ўспеў накрыць.

20 лістапада 1944 года мяне з братам прызвалі ў армію; іншы брат быў у сваякоў, а наймалодшы з мамай астаўся. Выклікалі нас у Свіслач, адтуль завезлі ў Гродна, з Гродна, яшчэ ў цывільнай вопратцы, завезлі ў Полацк, дзе абмундзіравалі. Пад Полацкам яшчэ многа немцаў пабітых ляжала, лясы былі спалены. Не хапала вады, то мы снегам мыліся. Мерзлую бульбу варылі, лупіны і рассыпаную кукурузу елі.



Фота АЛЯКСАНДРА ВЯРБІЦКАГА

*Дзмітры Вайцешык над брацкай магілай савецкіх салдат каля Габят*

7 студзеня 1945 года прывезлі нас поездам пад Варшаву. Я быў кулямётчыкам, спярша „Максіма” меў, пасля далі „Гарунова”. Каманда налічвала пяць чалавек: камандзір, двух стралкоў-наводчыкаў і двух падносчыкаў, што патроны падносілі. Спявалі мы песню:

*Я пулемётчиком родился,*
*Я пулемётчиком умру,*
*Я пули острой не боюся,*
*Я с пулей острой в бой пойду.*

Ад Варшавы да Берліна наступалі ўсё з баямі, праходзілі па 30-40 кіламетраў у суткі. Мы ішлі пяшком, а нашы кулямёты на конных вазах ехалі. Толькі на пазіцыю падцягалі мы іх уручную.

На подступах да Берліна загінуў мой брат. 16 красавіка 1945 года мяне раніла пад самым Берлінам — снайпер у плячо трапіў. Ляжаў я ў шпіталях каля дзесяці месяцаў: у Варшаве, Познані, Седльцах, Лодзі. Хацелі мне руку адняць, але я не згадзіўся, дык аднялі часць левай лапаткі. У Седльцах быў нямецкі лагер, дзе ад голаду памерла многа тысяч палонных. У Лодзі вельмі добра нас кармілі: штодзень па сто грам гарэлкі і пяць разоў у дзень есці давалі, абы толькі змог тое пераесці.

З Лодзі выпісалі мяне дахаты. Ехаў праз Гродна, на станцыю Бераставіца. Адтуль прыйшоў у Менчыкі, пераначаваў у сястры — ёй пяць кілаграмаў цукру са шпіталя прывёз. У шпіталі апранулі мяне ў нямецкі шынель з жоўтым каўнерам, што гестапаўцы насілі. Запынілі мяне на мосце, але я паперы меў і прыйшоў дахаты.

Мама жыла ў суседавай зямлянцы, бо ў нашу заходзіла вада, што вёдрамі трэба было выносіць. Пад сваё вяселле, што было ў канцы кастрычніка 1952 года, я яшчэ ў сваёй зямлянцы карову рэзаў і нагу сабе прабіў. Неўзабаве пасля вяселля паставіў я хату, якую раскідаў тры гады таму.

**Запісаў Аляксандр Вярбіцкі**

# Сустрэчы са скрыгітам

**Блізка дваццаць ансамбляў польскіх з Беларусі і беларускіх з Польшчы, значыць, каля трохсот выканаўцаў прыняло ўдзел у XIII мастацкіх сустрэчах Беласток-Гродна 17 ліпеня г.г. І ў гэты раз не абышлося без скрыгіту. У арганізацыі гэтага мерапрыемства і спадарожнічаючай ёй канферэнцыі „Шлях да ўзаемнасці” не прыняў удзелу Саюз палякаў Беларусі, улады якога былі дэлегалізаваны беларускім Міністэрствам юстыцыі.**

Канцэрт пачаў хор „Крыніца”, які дзейнічае пры галоўным арганізатары мерапрыемства — Беларускім грамадска-культурным таварыстве.

— Навуковая канферэнцыя і гэты фестываль гэта імпрэзы, якіх мэта — паяднанне краін і народаў, — вітаў памяркоўна сабраных гасцей у беластоцкім амфітэатры старшыня БГКТ Ян Сычэўскі. — Не было вякамі на гэтай тэрыторыі канфліктаў, асабліва ваенных. Беларусы і палякі жылі тут гарманічна і ў міры.



Фота МІРЫ ЛУКШЫ



Старшыня СПБ Анжаліка Борыс

Старшыня Ян Сычэўскі прывітаў ганаровых гасцей, сярод якіх апынуўся старшыня Падляшскага сейміка Збігнеў Кшывіцкі. Як шэф Падляшскага выбарчага штаба кандыдата на прэзідэнта Уладзімежа Цімашэвіча выкарыстаў ён канцэрт для збірання подпісаў пад спіскамі падтрымкі гэтаму кандыдату.

Спецыяльны ліст прыслаў сам Уладзімеж Цімашэвіч, завяршаючы паўнамоцтвы маршалак Сейма. Напісаў: „Гэта дасканалы доказ развою польска-беларускіх кантактаў”. Поспеху імпрэзе жадаў, таксама лістоўна, міністр па справах рэлігій і нацыянальнасцей беларускага ўрада.

Вядучыя канцэрт Часлаў Янушкевіч з Гродна і Ева Ласкевіч з Беластока пачалі яго адным з вершаў Віктара Шведа.

Сярод гледачоў былі члены выбранае ў сакавіку і распушчанае ўладамі ўправы Саюза палякаў Беларусі са старшынёй Анжалікай Борыс. Ян Сычэўскі прывітаў яе са сцэны як „прадстаўніка СПБ”. У размове з „Нівай” старшыня Борыс сказала:

— Для нас важна, каб сітуацыя вакол Саюза нармалізавалася. Нам, як польскай меншасці ў Беларусі залежыць, каб адносіны паміж Польшчай і Беларуссю былі як найлепшыя, каб наша палітычная сітуацыя не адбівалася на сітуацыі беларусаў у Польшчы. Сённяшняя палітыка нашых чыноўнікаў памылковая і не прыносіць нікому карысці, а нават робяць яны блага для беларускай дзяржавы. Маю, аднак, надзею, што знойдуцца ў Беларусі разумныя палітыкі.

І адзначыла:

— Трэба размаўляць, але пакуль што ніхто не шукае з намі кампрамісу.

Запытаная аб удзел СПБ у канцэрце і канферэнцыі Беласток-Гродна Анжаліка Борыс адказала:

— Наш Саюз быў ініцыятарам гэтага мерапрыемства. Сёлета нашага ўдзелу тут няма. Гродзенскія ўлады вырашылі, хто паедзе. Мы не былі запрошаны да супрацоўніцтва. Запрашэнне атрымалі мы ў апошнюю хвіліну. Мы ўтраіх з управы прыехалі на канцэрт, бо ж урэшце выступаюць тут нашы калектывы.

Канцэрту, як звычайна, спадарожнічаў кірмаш польскага і беларускага рукадзелля ды свае кнігі прэзентавалі беларускія паэты Беласточчыны, сярод іх Міра Лукша, Віктар Швед і Ян Чыквін ды варшаўскі Цэнтр славянскай прэсы і кніжкі.

Да століка рэдакцыйнай каляжанкі падышоў старэйшы мужчына:

— А, гэта па-руску, — сцвердзіў, аглядаючы яе кнігу „Бабскія гісторыі”.

— Не, па-беларуску, — адказала аўтарка.

— А, то я тым больш не разумею.

Зацікаўленнем цешыліся драўляныя фігуркі птушак Міраслава Наумюка, сына народнага разьбяра Уладзіміра, і анёлкі ягонай унучкі Элізы.

— Atmosfera jest super, — казалі маладыя выканаўцы, сыходзячы са сцэны.

Канцэрт папярэдзіла двухдзённая навуковая канферэнцыя, на якую „Ніва” не атрымала запрашэння. У Радыё Беласток Ян Сычэўскі гаварыў аб ёй:

— Да сёння цараць стэрэатыпы не заўсёды згодныя з праўдай. Таму навуковыя даследы могуць добра, аб'ектыўна паказаць факты якія датычаць польска-беларускага памежжа.

**Мацей Халадоўскі**

Фота МІРЫ ЛУКШЫ



# *Героі. Хто яны?*

Герой... гераізм... Што гэта такое? Іх вытокі. Каму яны патрэбныя? Ды яшчэ можна шмат паставіць пытанняў падобнага кшталту, а адказаў на іх можа быць больш, чым саміх пытанняў. А канкрэтна: гераізм — грамадская псіхалагічная, маральная з'ява, матывам праяўлення якой з'яўляецца гістарычная патрэба. Гераізм нараджаецца не па запатрабаванню, па надуманай заяўцы і не перадаецца па спадчыннасці так, як пяецца ў песні:

Павінен і сын героем стаць,
Калі бацька герой.

Сапраўдныя героі нараджаюцца, а не ствараюцца. Створаныя героі падобныя да штучных фарбаў, аб якіх гаварыў калісьці І. Крылоў, якія, у адрозненні ад натуральных, дажджу баяцца. Даждж для выдуманых герояў з'яўляецца праўда. Штучныя героі гэта дэкарацыя для пэўнай ідэалогіі, і вянуць яны з яе знікненнем. Яны — часовая з'ява.

Цяпер спынімся на прыкладзе, які з'яўляецца пацвярджэннем сказанаму.

У чацвёртым нумары дзятлаўскай раённай газеты „Перамога” (Гродзенская вобласць) ад 14 студзеня 2005 года ў рубрыцы „юбілеі” змешчаны артыкул пад назовам „Вензавецкі сельсавет учора і сёння”, аўтарам якога з'яўляецца старшыня сельсавета С. Шэцік. Артыкул прысвечаны 65 угодкам сельсавета. У ім успамінаецца першы яго старшыня Міхаіл Шундрык, які яшчэ да вайны кіраваў ім і з першых дзён пасля выгнання немцаў да 6 студзеня 1950 года ўзначальваў яго. У сваім артыкуле С. Шэцік паведамляе, што 6 студзеня 1950 года пры выкананні дзяржаўнага задання М. Шундрык быў па-зверску забіты бандытамі.

Вось і герой! Пакутнік за ідэю! Але элементы гераічнага тут адсутнічаюць.

На той час вёскі ў Заходняй Беларусі ў асноўным былі аднаасобніцкімі і кожнаму гаспадару даводзіўся план лесанарыхтоўкі і лесавывазкі. Сусед Шундрыка не меў каня, то ён мусіў нарыхтаваць толькі 20 кубаметраў лесу. Незадоўга да Каляд да яго зайшоў старшыня сельсавета М. Шундрык і ўчыніў яму сапраўдныяператрус: праверыў квітанцыі па здачы грашовага і прадуктовага падаткаў не толькі за апошні год, але і за ўсе папярэднія. Усё было здадзена. У беларусаў існуе такі звычай: да новага года трэба разлічыцца не толькі з людзьмі, але і з дзяржавай, каб на новы год нікому не быць вінаватым. Тады Шундрык абвініў суседа, што той не падрыхтаваў лесу. Сусед паказаў квітанцыю, у якой значылася, што ім нарыхтавана 20 кубаметраў лесу. Шундрык бярэ тую квітанцыю і рве на дробныя шматкі, а суседу выпісвае новае абавязацельства на нарыхтоўку не 20, а 30 кубаметраў лесу.

Апоўначы, 6 студзеня 1950 года М. Шундрык вяртаўся з папойкі. За вуглом яго хаты стаяў з сякераю ў руках ім пакрыўджаны сусед. Пасля іх сустрэчы Шундрык застаўся ляжаць мёртвым на сваім панадворку. Раніцай наляцела міліцыя, да яе выйшаў сусед і прызнаўся ва ўчыненым забойстве. У доказ свайму прызнанню аддаў сякеру, на якой была абледзянелая кроў Шундрыка. Сусед атрымаў 25 гадоў Калымы.

Цяпер варта спыніцца на расшыфроўцы некаторых дэталяў.

Першае. Піць гарэлку, ды яшчэ ноччу, для Шундрыка было выкананнем дзяржаўнага задання.

Другое. Па афіцыйнай версіі, так запісана нават у кнізе „Памяць”, Шундрык быў забіты па-зверску бандытамі. Каб так сцвярджаў на той час пакойны сам Шундрык, то яму можна было б паверыць: п'яному адзін чалавек мог і дваіцца, і траіцца. Аднак пакойнікі не размаўляюць, а гавораць за іх жывыя.

І сёння новыя аракулы камуністычнага ўчора запускаюць запыленыя бальшавіцкія кружэлкі, каб затуманіць людскую свядомасць і тым пазбавіць магчымасці думаць аб нашым сённяшнім дні і нашай будучыні. Нічога, шаноўныя, з вашых намаганняў не выйдзе: мы не тыя, што хлуснёю прымаюць за праўду. Хутка вы апынецеся на сметніку гісторыі.

**Мікола Грышан**
**Дзятлава, Беларусь**

## Беларускі Голас
## www.belaruskigolas.staronki.com

Цікава праглядзець тыя беларускія газеты ці часопісы, што выдаюцца ў іншых краінах. Гэта дае магчымасць не толькі даведацца, чым жывуць нашы суродзічы ў далечыні ад родных абшараў, але і здзейсніць своеасаблівую завочную вандроўку ў замежжа, паглядзеўшы на тую ці іншую краіну вачыма жывучых там беларусаў. Менавіта такія ўражанні ўзнікаюць, калі наведаеш сайт Беларускай нацыянальнай Грамады ў горадзе Львове.

Аб тым, што ўласна Львоў адыграў вялікую ролю ў гісторыі славянства, казаць залішне. З гэтым заходнеўкраінскім горадам звязаў лёс беларускую паэтку Алаізу Пашкевіч (Цётку), расійскага першадрукара Івана Фёдарава, польскага паэта Адама Міцкевіча і многіх іншых знакамітых асоб. Жывуць тут і сучасныя беларусы, якія не забываюцца аб Беларусі і носяць яе ў сваіх сэрцах. Відаць, менавіта гэта падштурхнула іх да стварэння ўласнай арганізацыі, якая і пачала выдаваць газету „Беларускі Голас”.

Дарэчы, уласна сайт узнік зусім нядаўна. На ім пакуль няма ані рубрык, ані іншых звыклых для Інтэрнэт-старонкі аздабленняў. У той жа час выгляд загалоўка вельмі прывабны. У левым баку месціцца эмблема арганізацыі, якая складаецца з Пагоні, украінскага і беларускага сцягоў, а таксама назвы Грамады на беларускай і ўкраінскай мовах і дэвіза „За нашу і вашу вольнасць”. Далей ідзе назва газеты і яе нумар.

Шчыра кажучы, пакуль сайт складаецца выключна з электроннай версіі „Беларускага голасу”, а дакладней першага яго нумара. Па ўсяму відаць, на свет гэтае выданне з’явілася недзе ў сярэдзіне вясны бягучага года, бо ў ім падаецца інфармацыя аб святкаванні чарговых угодкаў Дня Волі ў Мінску, а таксама месяцца некаторыя матэрыялы прысвечаныя гэтаму сьвяту.

Артыкулы, якія змешчаны на сайце, маюць нейкае гістарычна-настальгічнае адценне. Менавіта так можна ацаніць, напрыклад, словы аднаго з аўтараў выдання Сяржука Горбіка: „...Ці памятаеш род свой, мову маці сваёй і лёс бацькі? Памятаеш таго, першага з уласнага роду, хто вырошчваў хлеб... а можа будаваў гарады і храмы... а можа, пакінуўшы дом, пайшоў абараняць ад чужынцаў Родны Край і упаў з думай аб Цябе, яшчэ не народжаным...Ты памятаеш?! І будзе блаславенны Гаспадам той, хто мужна сустрэне позірк продка і скажа: ТАК!”

Тут змешчана таксама шмат інфармацыі на гістарычную тэматыку, якая распавядае хто такія беларусы, адкуль вядуць свой род, пра знакамітых суайчыннікаў, што пакінулі адметны след у мінулым.

Некаторыя артыкулы часам выклікаюць жаданне паспрачацца аб слушнасці зробленых у іх высноў. Гэта тычыцца ў першую чаргу велізарнага артукула ўсё таго ж Горбіка, дзе месціцца інфармацыя пра беларусаў з даўніх часоў да сучасных падзей. Здаецца, што аўтар вельмі аднaзначна ацэньвае падзеі ў Беларусі падчас другой сусветнай вайны і не адлюстроўвае ўсіх аспектаў і чыннікаў таго часу.

У выданні шмат месца аддадзена розным бакам рэлігійнага жыцця, якое нейкім чынам звязана з беларускай нацыянальнай ідэяй.

Адной з найцікаўшых інфармацый для людзей, што вельмі нямнога ведаюць пра Львоў, можна назваць занатоўку „Вандроўка”. Менавіта ў ёй распавядаецца пра тое, як бачыць беларус львоўскую рэчаіснасць, жывучы ў гэтым цудоўным горадзе, далёка ад Радзімы.

**Уладзімір Лапцэвіч**

*Ураджэнка Віцебска Зінаіда Стагурская ў 2000 годзе выйграла адну з сама прэстыжных шматдзённых гонак прафесіяналаў „Джыра д’Італія”...*

# Беларусь, беларусы...



### Годны рэзерв

Чэмпіянат Беларусі па веласпорце, які прайшоў у горадзе над Нёманам па трасе Гродна — Капцёўка, выклікаў вялікую цікавасць спецыялістаў і мінімальную гледачоў. Не ўмеюць пакуль у нас рэкламаваць належным чынам гонкі на раварах. Так што ім па папулярнасці далёка да гульнёвых відаў спорта. Першынство краіны сабрала не ўсіх мацнейшых гоншчыкаў. Не прыехаў пасля хваробы Канстанцін Сіўцоў, а Аляксандр Усаў у Францыі займаўся пытаннем свайго выступу на „Вялікай пятлі” (на жаль, яму так і не ўдалося трапіць у заяўку на „Тур дэ Франс”, а меў шанцы стаць першым беларусам на гэтым папулярным змаганні). Астатнія былі ў баявой гатовасці, што і прадэманстравалі. У гонцы з раздзельным стартам на 40 км без праблем канкурэнтаў апярэдзіў Васіль Кірыенка. Гэта ўжо другі чэмпіёнскі тытул прадстаўніка Гомельшчыны. У групавой гонцы на 210 км вызначыўся Аляксандр Кучынскі з Віцебшчыны. Парадаваў спабор маладых гоншчыкаў (наміналцыя да 23 год), які паказаў, што рэзерв падрастае годны. Лідэрамі моладзевай дружыны ёсць гоншчыкі Браніслаў Самойлаў, Андрэй Куніцкі, Сяргей Даўбнюк, якія выступаюць за італійскі клуб „Палацагга” — туды іх уладкаваў Яўген Сенюшкін, які нядаўна скончыў сваю прафесійную кар’еру.

Што датычыць жанчын, то сама знакамітай з беларусак ёсць Зінаіда Стагурская, якая доўгія гады ўваходзіць у эліту. Яна дасягнула найбольшага поспеху ў гісторыі беларускага веласпорту — нараджэнка Віцебска ў 2000 годзе выйграла адну з сама прэстыжных шматдзённых гонак прафесіяналаў „Джыра д’Італія”. Такога не дасягала аніводная з постсавецкіх спартовак. На нядаўнім міжнародным турніры ў Італіі Стагурская стала пятай. За польскі клуб выступае Вераніка Шарамецьева, за італійскі Вольга Гаева. У гонцы па Польшчы Гаева выйграла сама цяжкі горны 96-кіламетровы этап, дзякуючы чаму стала першай і ў агульным заліку. У рэзерве беларускай дружыны юныя Алеся Белайчук і Вікторыя Чайка. На чэмпіянаце краіны большыня мацнейшых не ўдзельнічала, а перамогу на абедзвюх дыстанцыях святкавала дасведчаная Таццяна Шаракова (яна спецыялізуецца таксама на трэкавых відах). Зінаіда Стагурская не прыехала, затое выступіла яе 17-гадовая дачка Святлана, якая ледзь не „зачапілася” за п’едэстал. А вось маці актыўна выяўляла сябе на сёлетнім „Джыра д’Італія”, які праходзіў адразу пасля чэмпіянату Беларусі. Зінаіда была ў прызах на асобным этапе, але ў выніку заняла на прэстыжнай гонцы 6-е месца. Затое Вольга Гаева, спыніўшыся на 20-й агульнай пазіцыі, стала мацнейшай (!) у моладзевым заліку. Гэта першае сур’ёзнае дасягненне перспектыўнай раварысткі.

Моцны рэзананс у веласпорце выклікала пастанова Міжнароднага звязу веласіпедыстаў пра выключэнне з праграмы летніх алімпійскіх гульняў адной з трэкавых дысцыплінаў — гіту. З гэтай нагоды вельмі прыкра нашай Наталлі Цылінскай — беларуска ёсць адной з мацнейшых у свеце ў гэтай дысцыпліне. Чэмпіёнка свету і бронзавая прызёрка апошняй алімпіяды ў гонцы па трэку на дыстанцыі 500 м траціць цяпер надзеі ў адной з дзвюх сваіх каронных дысцыплін.

**Уладзімір Хільмановіч**

# *Нюансы перыферыі*

*Калі вы ніколі не былі ў Свіслачы, невялічкім раённым цэнтры Гродзеншчыны, то ўсе іншыя паездкі ды вандроўкі не маюць аніякага сэнсу. Вы проста цягаліся, як той дурань з торбай і ў кожным новым месцы сумавалі ад занудлівай логікі пазнанага.*

*У Парыжы можна паглядзець толькі Парыж. У Мінску, Варшаве ці Берліне вы ўбачыце адно і тое ж — мітусню людзей вялікага горада. Можа нават атрымаеце пэўную асалоду ад іх разгубленых, дэзарыентаваных інтэнсіўнасцю жыцця твараў. У Маскве вы проста заблукаеце, і не зможаце пазбавіцца адчування, што заехалі занадта далёка ад сваёй планеты. А вось пасля наведвання Свіслачы знакамітая кніга Гінеса падасца сумнымі занатоўкамі для гультаёў.*

*Чаго вартая толькі адна „славутая” „Алея герояў”. Перад уваходам вас вітае інтэрнацыянальная, ці калі выслаўляцца па сэнсе, антынацыянальная савецкая зорка і прывітальны надпіс украінскіх нацыяналістаў „Слава героям”. Кожнаму, хто гэта бачыць, хочацца стаць стромка, з імпэтам перакананага нацыяналіста адказаць надпісу: — „Героям слава!”, ды заспяваць інтэрнацыянал зорцы. А на самой алеі стаяць адзін каля аднаго помнікі Сталіну і Траўгуту, Леніну і Кастусю Каліноўскаму. Чаму гэтых ідэалагічных антыподаў аўтары праекта паставілі разам, растлумачыць проста. У Свіслачы навучыліся гнаць вельмі моцную самагонку, якую мясцовыя аматары нездаровага ладу жыцця называюць карчоўкай. Хіба таму, што вырабляюць яе пад карчамі ў Белавежскай пушчы. А можа таму што гоняць з карчоў. Але хто яе пакаштуе, пачынае бачыць сэнс жыцця ў абсурднасці. Хіба таму мясцовыя ўлады з перапою і залічылі ў героі беларускага народа ўсіх асоб, помнікі якім мелі.*

*Да 1994 года ўлада і апазіцыя жылі па-прыяцельску. Віталіся, размаўлялі, часамі пагаджаліся ў поглядах, дзякуючы ўсё той жа карчоўцы. Людзі там шчырыя. Там нават сабакі гуляюць з зайцамі. У даганянкі. І калі зайца не дагоняць, то нічога кепскага яму не чыняць. А вось пасля змены ўлады ў Мінску, мірнае суіснаванне розных палітычных поглядаў, нават у межах аднаго асобнага раённага цэнтра, закончылася. Дайшло аж да арыштаў.*

*Надумаліся апазіцыянеры ўшанаваць памяць паўстанцаў 1863 года. Паклалі на магілу Віктара Каліноўскага кветкі. Нікога не чапалі. А ўлады чагосьці засталіся незадаволенымі. Ці іхным Сталіну з Леніным не было каму кветак купіць, ці хто вышэй загад аддаў. Пахапалі міліцыянты апазіцыянераў, ды прывалаклі ў пастарунак, як паўдуркі кніжкі на лацінскай мове. А што далей рабіць — не ведаюць. Мітусяцца, круцяцца як вошы на грэбені, кансультуюцца па тэлефонах. Начальнік міліцыі, хіба каб час зацягнуць, нават пачаў прыдурвацца:*

*— Хлопцы, я ж за вас. Проста ў мяне работа такая. Халера б яе ўзяла. Я за вашага Пазняка галасаваў. І за гэтага..., як яго..., забыўся. Вы мне падпішыце пратаколы, а я скажу знаёмаму суддзі, каб не прыдзіраўся. Дасць вам толькі папярэджанні. І то, пасля возьме на тыдзень адпачынак, каб замаліць гэты грэх у царкве.*

*— Мы яму самі грэх адпусцім. Толькі пабажыся, што і ён за Пазняка, — рагочуць затрыманыя, бо ім усядно рабіць няма чаго. З працы даўно павыганялі. Іншага занятку акрамя палітыкі не знойдзеш. Вось і цешацца з міліцыянтаў. Часамі пагульваюць. Прыдурваюцца. А якая будзе кара, ведаюць раней чым суддзя. Людзі з вопытам. І не памыліліся. Суд пакараў кожнага доларам пад васемсот. З залы суда выйшлі дзвюма рознымі групамі. Міліцыянты, якія на гэты раз былі хлуслівымі сведкамі, вывалакліся самі сабе. Апазіцыянеры, ці на праўнай мове гэтага дня — абскарджаныя, самі сабе. Кінуўшы ў бок фальшывых сведкаў пару-тройку нецэнзурных выслоўяў з рускай мовы, апазіцыянеры пацягнуліся „палепшыць” матэрыяльнае становішча да бліжэйшай кропкі продажу карчоўкі. Там яны яшчэ раз убачыліся з прадстаўнікамі праваахоўных органаў, якія планавалі зрабіць тое ж. Але ўбачыўшы людзей, якія на гэты раз ужо па-беларуску выказалі жаданне падбіць вока — паўцякалі.*

*Карчоўка скончылася апоўначы. Таму аднаму з апазіцыянераў прыйшлося пайсці ў рэстаран. А там з чорнымі як зямелька ад колькасці выпітага мордамі, сядзелі тры міліцыянты. Апазіцыянера як чорт намовіў. Ён сеў да тых за столік, наліў сабе іхнай гарэлкі, выпіў і спакойным, як у белавежскага зубра, рыкам звярнуўся да разгубленых ахоўнікаў парадку.*

*— Ну што, казлы, папаліся. Мы сфільмавалі на відэастужку, як вы тут прапіваеце свой сабачы хлеб. Заўтра перашлём яе ў Мінск. Вашае ж начальства вас і папрэ з працы. А вы думалі мы не адпомсцім?*

*Адзін з міліцыянтаў стаў азірацца і закрываць рукамі пагоны. Другі засланяў твар. А трэці штосьці хацеў адказаць, але нечакана для сябе закрыў рукой рот. А праз хвіліну, як па камандзе, яны кінуліся да дзвярэй, пакінуўшы на стале фуражкі.*

*Ніхто з прысутных гэтаму факту не здзівіўся. Маладая афіцыянтка звярнулася да апазіцыянера:*

*— Мы за вас прагаласуем на выбарах. Абавязкова. Толькі не паразганяйце з рэстарана рэшту кліентаў.*

*Ды апазіцыянер гэтага ўжо не чуў. Ён спяшаўся да сяброў расказаць гэтую гісторыю. І добра ведаў, міліцыянты сваім сябрам яе не распавядуць.*

***Генрых Зпадашмянскі***

# Юбілей людскага чалавека

Роўна ў свае восемдзесят, 26 чэрвеня 2005 г., на Усіх святых, Міхась Хмялеўскі сустракаў у беларускім таварыстве гасцей — сяброў, сваякоў, калег па пяру і дзейнасці на беларускай ніве. Былі віншавальныя лісты ад Пасольства Беларусі ў РП, ад беластоцкіх улад, добрыя словы ад духоўных асоб, паколькі шаноўны юбіляр шчыры і дабрадзейны прыхаджанін і хрысціянін, на спагаду і падтрымку якога кожны можа разлічваць. Прагучалі словы ўшанавання „чалавека беларускай справы”, які разам з БГКТ ад самога пачатку, значыць, паўстагоддзя. „Пачоту многа — грошай мала, і так бывала!” — жартаваў ніўскі журналіст, які працаваў у нас на штаце 33 гады, да 1988 г., але і да сёння на нашых старонках чытачы могуць пазнаёміцца з допісамі найбольш вядомага ім асабіста журналіста, які ў кожнай вёсцы ды мястэчку ведаў кожнага вартага чалавека. Значыць, усіх людзей, бо кепскіх не баяўся і ўмеў востра папракнуць настолькі паспяхова, што казалі, уявіце сабе: „Больш не буду!” Гэткай моцы сёння хіба журналістыка не мае, ды і дзе сённяшнім пісакам, хоць і адукаваным, да таго пачуцця місіянерства і праўдалюбства, характэрнага старой журналісцкай школе ды сумленным людзям самапіскі ці друкавальнай машынкі. Праўда, цяпер нават Міхась Хмялеўскі сеў у свае восемдзесят за камп’ютэр. І гэта таксама выклікала агульнае прызнанне сабраных, тая сучаснасць юбілярава, маладзецтва і весялосць у атачэнні вянка ўнукаў, сяброў ды пасівелых калег. Найбольш успамінаў звязаных з юбілярам мелі тыя, хто разам з ім працаваў дзеля беларускай справы ад самага пачатку — ніўцы, бэгэкатоўцы, аматары беларускай культуры, сярод якіх юбіляр актыўна дзейнічае, хоць некаторыя з іх хто пайшоў на пенсію, хто ў большую палітыку...


Фота МІРЫ ЛУКШЫ

*Міхась Хмялеўскі ў вянку ўнукаў*

Адзін з аднагодкаў Міхася Хмялеўскага, Уладзімір Юзвюк (яму ў ліпені таксама круглая дата — 80 гадоў) гэтак успамінаў і свае сцежкі праз беларускія палеткі:

— Па волі лёсу мы не змаглі падружыць будучы ў 1944-1946 гадах юнакамі і вучнямі адной і той жа школы ў Беластоку па вул. Кіеўскай 1, званай беларуска-рускай гімназіяй, а пасля і школай паўшэхнай. Юбіляр з Вострава на Сакольшчыне, я з Трасцянкі на Бельшчыне, спыніліся ў адзінай такога тыпу школе ў гэтай часткі Беласточчыны, упарта вучыліся, наганяючы гады страчаныя для навукі ў час нямецкай акупацыі... Тады мы яшчэ не пазнаёміліся. У 1946 г. школу нашу ўлады ліквідавалі, а нашы лёсы цалкам разышліся. Наш юбіляр трапіў у Ленінградскі універсітэт, я, пасля пару гадоў настаўніцкай працы — у Мінскі універсітэт. Чарговы раз мы сустрэліся праз 10 гадоў, ужо як падрыхтаваныя да працы трыццацігодкі і набліжаліся да сяброўства пры розных нагодах дзейнасці ў БГКТ і „Ніве”. Міхась, як у той час адзіны ў „Ніве” прафесійны журналіст, быў вельмі руплівым і непасрэдным з насельніцтвам збіральнікам інфармацый аб яго жыцці, мерапрыемствах БГКТ і праўдзіва інфармаваў аб іх на старонках „Нівы”. Яго паважалі настаўнікі, асабліва тыя, што вучылі роднай мовы, любілі ўдзельнікі мастацкай аматарскай самадзейнасці, дзеячы БГКТ — усе, каму беларушчына дарагая і блізкая, як кашуля целу. Міхась трапіў быў ва ўлады БГКТ. Я быў сакратаром БГКТ пры старшынях ГП: Уладзіміры Станкевічу, Лідзіі Бялецкай, дэпутаце Сейма Макару Дземіяновічу. Урэшце стаў ім у 1963 г. Міхась Хмялеўскі, які вёў сваю дзейнасць на грамадскіх асновах. Быў ён старшынёю ГП у 1963-1966 гг., у 1966-1968 гг. членам прэзідыума ГП, у 1969-1972 гг. зноў старшынёю, а ад 1972 г. тры кадэнцыі (да 1984 г.) старшынёю Галоўнай рэвізійнай камісіі БГКТ, да 1997 г. яе членам, а ад 1997 г. зноў старшынёю ГРК. Разам гэта 50 гадоў грамадскай дзейнасці ў БГКТ...

Пералікі са спіска функцыяў і ўзнагарод юбіляра перапляталіся са сваяцкімі і сяброўскімі ўспамінамі. Міхась Хмялеўскі быў і „да раны прыкласці”, і моцны духам. Успамінаў сенатар Сяргей Плева, які ў той час выступаў у беларускіх калектывах, як выйшлі маладыя беларусы з рэпетыцыі ў беларускім цэнтры па вуліцы Ліпеньскага маніфесту, а пасярод Беластока ішоў натоўп, які забіраў з кіёскаў нававыдадзеную „Ніву” і дэманстратыўна паліў яе як паходні. Кінуліся біцца хлопцы за сваё, а Міхась спыніў іх, супакоіў. «Воны прошлі, „Ніва” зосталась! — а ўсё ж магло б быць з намі, і невядома дзе кожны з нас быў бы сёння і як справы пайшлі б тады», — Сяргей Плева быў тады адным з больш баявітых таленавітых беларусікаў, што гатовы былі кінуцца нават на нажы. „Сіла спакою”, развагі да таго ж немалой пасіі ды пачціваcці Міхася Хмялеўскага дала ў выніку „людскага чалавека”, сустрэча з якім пакінула ў чалавечых памяці і сэрцах добры ўспамін і ўдзячнасць, а на старонках „Нівы”, дзе юбіляр да сёння публікуе свае допісы ўжо амаль паўстагоддзя, след ад працы іншых „майстроў на ўсе рукі”, руплліўцаў на беларускіх палетках.

**Міра Лукша**

## 24.07 – 30.07

**Баран (21.03. — 19.04.)** Магчымыя расчараванні, бо пераацэніш свае магчымасці. Найлепш на гэты час заплануй кароткі адпачынак. Распырснецца вясёлы настрой, пагрузішся ў рэфлексіўнасць. Складанасці ў любоўных заваёвах.

**Бык (20.04. — 20.05.)** Бярыся за найбольш рызыкоўныя планы — ты непераможны. Можаш спаткацца з людзьмі, якіх доўга не бачыў.

**Блізняты (21.05. — 21.06.)** Да 25.07. ненайлепшы час на любоўныя прызнанні. Не думай увесь час, што марнуеш нагоды і шанцы. Найлепшыя шанцы там — дзе ты!

**Рак (22.06. — 22.07.)** Расчараванні, а нават невялікія паразы. Можаш шмат страціць, калі не выкарыстаеш шанцаў, якія адкрываюцца перад табою. Можа быць нецікавая сітуацыя ў фірме з-за супрацоўніка, які пачне распіхацца; не паддавайся правакацыям і кафліктам.

**Леў (23.07. — 22.08.)** Шмат энергіі, энтузіязму, новых шанцаў. Можаш дазволіць сабе ашалець ад кахання, але не думай, што маленькі раманік на баку ўратуе тваё сужонства. Якая праца, такая заплата.

**Дзева (23.08. — 22.09.)** Можаш чакаць нейкіх складанасцей. Плануючы штосьці, мусіш пазашпільваць усе справы на ўсе гузікі. Усе свабодныя Дзевы знойдуць файных аматараў.

**Шалі (23.09. — 22.10.)** Раптоўныя сэпкі з партнёрам закончацца альбо ачышчэннем атмасферы, альбо канчатковым расстаннем. Апазіцыя Урана да Венеры спрыяе стаўленню спраў на лязе нажа! Будзь абавязковы, пільнуй кар’еры і рацыянальна выдавай грошы — спадзявайся вынікаў!

**Скарпіён (23.10. — 21.11.)** Зноў шаленствы! Твой тэмперамент у гэтым месяцы сапраўды не ўтаймаваць! Трымай за храпы лішнія амбіцыі, бо неўзабаве Сатурн можа цябе прыструніць. Не прастынь.

**Стралец (22.11. — 21.12.)** Твае супрацоўнікі міла цябе задзівяць. У гарачцы пошукаў партнёра можаш не звярнуць увагі на кагосьці ціхага, малакідкага, але які быў бы для цябе другой палоўкай яблыка.

**Казярог (22.12. — 19.01.)** Добра ацэняць твае таленты на працы. З 29.07. будзеш ірытавацца, цяжка будзе табе сабраць думкі. Можа не хапіць цярплівасці, асабліва ў кантактах са старэйшымі асобамі. Зашмат працы добра служыць прафесійным амбіцыям, але не здароўю.

**Вадалей (20.01. — 18.02.)** Твае рашэнні хай будуць абдуманыя, бо раптам пацягне цябе на дурноту, асабліва ў фінансах. Часта набліжаешся да мяжы, якая пагражае стратай фінансавай бяспекі, хоць да банкруцтва яшчэ далёка.

**Рыбы (19.02. — 19.03.)** Венера ў знаку Дзевы гарантуе добры час у любові. Ідылія ў пастаянннай пары. Зайграй у латарэю, калі яшчэ не выйграў. Не мяняй працы, пачакай яшчэ трошкі. Давярай лёсу, ён падсуне табе найлепшыя адказы на пытанні.

**Агата Арлянская**

## Адгаданка




1. слуцкая рака, 2. навасібірская рака, 3. кракаўская рака, 4. слонімская рака, 5. блакітнапялёсткавая „памятлівая” расліна, якая расце м.інш. на падступах да вадаёмаў. **(ш)**

Адгаданыя словы запісаць у вызначаныя дарожкі, пачынаючы ад поля з лічбай. У светлых палях атрымаецца рашэнне. Сярод чытачоў, якія на працягу месяца дашлюць у рэдакцыю правільныя рашэнні, будуць разыграны кніжныя ўзнагароды.

**Адказ на адгаданку з 24 нумара**

Верш, Рыга, пячора, кума, арэапаг, Каяловіч, Акмола, Ліда, каса, морда, каляндар. Рашэнне: **Першая чарка калом, а другая сакалом.**

Кніжныя ўзнагароды высылаем **Лукашу Пацэвічу** з Беластока і **Казіміру Радошку** са Свебадзіцаў.

Ніва
ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ
PL ISSN 0546-1960
NR INDEKSU 366714
**Nakład**: 1 003 egz.
**Выдавец**: Праграмная рада тыднёвіка „Ніва”.
**Старшыня**: Яўген Вапа.
**Адрас рэдакцыі:** 15-959 Białystok 2, ul. Zamenhofa 27, skr. poczt. 149.
**Тэл./факс:** (+48 85) 743 50 22.
**Internet**: *http://niva.iig.pl/*
**E-mail**: *redakcja@niva.iig.pl*

*Zrealizowano przy udziale wsparcia finansowego Ministra Spraw Wewnętrznych i Administracji.*
**Галоўны рэдактар:** Яўген Вапа.
**Намеснік гал. рэдактара:** Віталь Луба.
**Сакратар рэд.:** Аляксандр Максімюк.
**Рэдактар „Зоркі”:** Ганна Кандрацюк-Свярубская.
**Публіцысты:** Міхась Андрасюк, Мікола Ваўранюк, Аляксандр Вярбіцкі, Ганна Кандрацюк-Свярубская, Міраслава Лукша, Аляксей Мароз, Ада Чачуга, Паўліна Шафран-Асташэвіч.
**Канцылярыя:** Галіна Рамашка.
**Камп’ютэрны набор:** Яўгенія Палоцкая, Марыя Федарук.
**Друкарня**: „Orthdruk”, Białystok.
Tekstów nie zamówionych redakcja nie zwraca. Zastrzega sobie również prawo skracania i opracowania redakcyjnego tekstów nie zamówionych. Za treść ogłoszeń redakcja nie ponosi odpowiedzialności.
**Prenumerata:** 1. Termin wpłat na prenumeratę na IV kwartał 2005 r. upływa 5 września 2005 r. Wpłaty przyjmują urzędy pocztowe na terenie woj. podlaskiego i oddziały „Ruch” na terenie całego kraju.
2. Cena prenumeraty na IV kwartał 2005 r. wynosi 26,00 zł.
3. Cena kwartalnej prenumeraty z wysyłką za granicę pocztą zwykłą — 120,00; pocztą lotniczą Europa — 133,00; Ameryka Płn., Płd., Środk., Afryka, Azja, Australia — 147,00. Wpłaty przyjmuje „RUCH” S.A., Oddział Krajowej Dystrybucji Prasy, ul. Jana Kazimierza 31/33, 01-248 Warszawa, Pekao S.A., IV O/Warszawa, Nr 68124010531111000004430494.
4. Prenumeratę można zamówić w redakcji. Cena 1 egz. wraz z wysyłką w kraju wynosi 3,50 zł, a kwartalnie — 45,50 zł; z wysyłką za granicę pocztą zwykłą — 4,70 (kwartalnie — 61,10), pocztą priorytetową: Europa — 5,90 (76,70), Ameryka Płn., Afryka — 6,60 (85,80), Ameryka Płd., Środk., Azja — 7,40 (96,20), Australia — 9,60 (124,80). Wpłaty przyjmuje Rada Programowa Tygodnika „Niwa”, Białystok, ul. Zamenhofa 27, nr konta BPH PBK SA Oddział w Białymstoku 77 1060 0076 0000 4011 5001 5504.

*Першы раз я патрапіла ў Гарадок у 2000 г., калі мне было васемнаццаць, але ў той час узрост не быў ужо аргументам — я ехала на „Басовішча” выступіць і кропка. Ды ніякай дыскусіі на гэты конт!*

# Пакаленне „Басовішча”?

**Басовішча 2005**

***Гарадок, Беласточчына***

22 ліпеня (пятніца)
$16^{00}$ — $20^{40}$ Вольная Сцэна, потым — канцэрты да $3^{30}$

23 ліпеня (субота)
$14^{00}$ — $3^{30}$ канцэрты

**Размова з Іллонай КАРПЮК, старшынёю Беларускага аб'яднання студэнтаў у Польшчы (БАС) ды арганізаткай XVI Фестывалю музыкі Маладой Беларусі „Басовішча 2005”.**

***— У гэтым годзе 16-ы выпуск Фестывалю — дастаткова часу, каб ад малога ўзрасло новае пакаленне слухачоў. Ёсць на „Басовішчы” асобы, для якіх Фестываль існуе „ад заўсёды”?***

— Такія людзі ёсць. Мабыць, некаторым думаецца, што яны не ўмеюць на Фестывалі стварыць адпаведнай атмасферы. Праўда аднак такая, што сярод публікі, побач людзей, якія стваралі імпрэзу — сёння ім за трыццаць і сорак — ёсць людзі, якім па пятнаццаць-шаснаццаць. І ўсе яны добра гуляюць. Гэта і гімназісты, і ліцэісты, і студэнты — сярод іх не толькі дзеці заснавальнікаў „Басовішча” (іхняя зацікаўленасць беларускай музыкай самазразумелая), але і моладзь, якая сама па сабе цікавіцца беларускім рокам. Яшчэ іншую групу публікі складаюць сем'і — бацькі з дзеткамі...

***— А то мілая традыцыя, так яно збольшага і пачыналася, што ў Барык людзі прыходзілі цэлымі сем'ямі...***

— Гэта вельмі істотнае, бо хтосьці можа даказваць, што на такі фестываль, дзе натоўп маладых людзей, у якіх розныя свае думкі, небяспечна пускаць дзяцей. А вось на „Басовішча”, насуперак такому погляду, прыбываюць і цэлыя сем'і ды яны таксама знаходзяць сваё месца.

***— Ілона, а Ты калі ўпершыню з'явілася на „Басовішчы”? Раскажаш пра гэта?***

— Даволі позна. Да таго часу, калі я першы раз паехала на „Басовішча”, на кожным яго выпуску пабывалі браты маёй мамы, якія і расказвалі ёй пра Фестываль. З расказаў тых мама зрабіла вывад, што дзяўчына, якой не споўнілася 18 гадоў, не павінна адна ехаць у Гарадок...

***— ... і стрымала слова?***

— Так, хоць гэта магло памяняцца ў 1999 годзе, калі я мела выступіць на „Басовішчы” з гуртом „Гоман”. Маім бацькам было таксама важна тое, што на Фестываль я еду, як асоба, якая там выступае. „Гоман” аднак у той час раз'ехаўся па свеце і, нягледзячы на тое, што нас прынялі ў конкурс, выступіць у ім аказалася фізічна немагчыма. Першы раз я патрапіла ў Гарадок у 2000 г., калі мне было васемнаццаць, але ў той час узрост не быў ужо аргументам — я ехала на „Басовішча” выступіць і кропка. Ды ніякай дыскусіі на гэты конт! Бацькі сказалі: „О! То мы таксама прыедзем” — з гэтага часу бацькі і частка мамінай сям'і з году ў год прыязджаюць на Фестываль.

***— На якой музыцы Ты ўзрастала? Чаго Ты слухала ў школе?***

— На Беласточчыне атмасфера спрыяе таму, каб выхоўвацца на беларускай фальклорнай музыцы і ад гэтага я не адракаюся. Побач калектываў, якія магла я ўбачыць і пачуць на фэстах, з'явілася рок-музыка — 



— На „Басовішча” прыбываюць і цэлыя сем'і ды яны таксама знаходзяць сваё месца...




Плакат сёлетняга Фестывалю

Фота МІХАЛА КОСЦЯ



Успамін „Басовішча 2002”

яшчэ ў пачатковай школе я слухала „Куін”, „Металіку”, „Раксет” і Майкла Джэксана. Пад канец школы зацікаўленасць пайшла ў розныя бакі, слухала ўсяго, што заходзіла на высокія месцы польскіх гіт-парадаў, але гэта быў такі эпізод. Усё ж шляхі, так ці інакш, вялі да рок-музыкі, спектр якой напраўду вельмі шырокі. Я ніколі не абмяжоўвалася да класічных крыніц рока, як „Пінк Флойд” ці „Блэк Сабат”, ці ўсяго таго, што з гэтага вырасла, але слухала і фольк, як крыніцы ўвогуле музыкі, брала адтуль усё, што мне было даспадобы ды перапрацоўвала яго ў формы, якія мне адпавядалі.

***— Дапусцім тэарэтычную сітуацыю, што Ты пад прымусам назваць аднаго сучаснага беларускага выканаўцу, які па Тваіх мерках самы выбітны, заслужаны... Хто б гэта быў?***

— Для некаторых мой выбар можа паказацца не зусім сучасным, бо людзі глядзяць на сучаснасць таксама праз прызму ўзросту музыкаў. Для мяне гэта аднак гурт „Уліс” — складаюцца на гэта і мастацкія дасягненні, і змест, які гурт укладае ў свае кампазіцыі. А так ужо выходзіўшы з-пад прымусу, дык дадала б я тут і „Троіцу”, як прыклад і ўзор для многіх выканаўцаў этна-музыкі.

***— Ілона Карпюк гэта пільная студэнтка?***

— О так, я была вельмі пільнай студэнткай. Мабыць, зараз крыху менш, бо жыццё ўсё ж уносіць свае карэктывы. Актуальна намагаюся закончыць факультэт сацыялогіі ды перамяшчаюся паміж Варшавай і Беластокам. Гэта вынік таго, што пачала я ў Варшаве сваю вучобу на інтэрдысцыплінарным гуманітарным факультэце. У мяне былі шырокія навуковыя зацікаўленні...

***— Ці зараз сярод сябраў БАС нейкія факультэты асабліва папулярныя?***

— Калі хто трапляе ў Варшаву, то няма нейкага жалезнага прынцыпу — папулярны мой інтэрдысцыплінарны факультэт, але і шмат якія прафесійныя. Калі гаварыць пра Беласток, дык тут БАСаўцы ў пераважнай большасці студэнтамі беларускай філалогіі.

***— У роднай Гайнаўцы больш ведаюць Цябе ці сястру Маргарыту, якая расславіла горад ва ўсяпольскім тэлебачанні?***

— А вось з гэтым, то я ўвогуле не ведаю, што зараз адбываецца. Часта людзі, якія ведаюць мяне даўжэй за сястру, клічуць мяне „Госяй” — я ўжо звыклася з гэтым і не выпраўляю іх.

***— Калі нас тут у „Ніве” сталі прыцiскаць судамі, то бацькі Тваe моцна захваляваліся, што па вушы сядзіш у беларускіх справах, ад якіх толькі бяды выглядаць?***

— Бацькі не, больш за ўсё гэта перажываю я. Бацькі вераць у маю шчырасць і сумленнасць ды ведаюць, што людзі, з якімі маю дачыненне — такія ж.

***— Дзякую за размову і да сустрэчы на „Басовішчы”.***

**Гутарыў Аляксандр Максімюк**

ISSN 0546-1960